КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №2 (130)
◂ 23 СТУДЗЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**У ПРЭЗІДЭНТЫ АХВОЧЫЯ**

Стар. 4

**QUO VADIS?**

25 студзеня ў Маскве пачне працаваць Памесны сабор Рускай праваслаўнай царквы...

Стар. 6

**FIRST PET — ПЕРШЫ САБАКА ШТАТАЎ**

Для шматлікіх амерыканцаў, асабліва маленькіх, пытанне, якога сабаку абярэ прэзідэнт Барак Абама, каб забраць яго ў Белы Дом, застаецца больш важным, чым вайна ў Газе або эканамічны крызіс.

Стар. 11

**ФРАНАЧАК**

Адкуль увогуле гэтае панібрацкае «Франак» у загалоўках навінаў, рэпартажах, і нават у назве артыкула Вікіпедыі?

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Нарыс Сяргея Гваздзёва**

**«Заходне-беларуская мастацкая плынь»**

Працяг цыкла нарысаў пра мастакоў Віленскай школы

АД РЭДАКТАРА

# ІНАЎГУРАЦЫЯ. НОВЫ КУРС

Аляксей КАРОЛЬ

**Выбары новага прэзідэнта — заўсёды падзея. Безумоўна, найперш для грамадзян той краіны, дзе яна адбываецца. Але не толькі. Асабліва калі гэта змена лідэраў у такой краіне, як ЗША. Краіне, якая была і ёсць, па вызначэнню новага прэзідэнта Барака Абамы, «самай квітнеючай ды магутная краінай у свеце». Звышдзяржава, палітыка якой, нават здавалася б выключна ўнутраная, так ці інакш адгукаецца ва ўсім свеце.**





І не выпадкова ўвесь свет столькі ўвагі надае феномену Барака Абамы — першага ў гісторыі Злучаных Штатаў прэзідэнта афраамерыканскага паходжання. І выбудоўвае аналітычныя схемы яго новага курса.

Зразумела, што не толькі гэтай асаблівасцю — першы афраамерыканец-прэзідэнт — вызначаюцца як энтузіязм у адносінах да Абамы амерыканцаў, так і выключная ўвага да яго сусветнай супольнасці.

Чэргі на выбарчых участках, натоўпы людзей уздоўж чыгункі, што па ўсяму маршруту сустракалі цягнік, якім ехаў абраны прэзідэнт у Вашынгтон на цырымонію прынясення прысягі, два з паловай мільёна прысутных на інаўгурацыі… Іх ніхто не прымушаў, не арганізоўваў па разнарадцы зверху. Яны ішлі па поклічу душы. Рэйтынг даверу да Абамы — 79 працэнтаў, за якім і больш за палову былых прыхільнікаў Маккейна. Але ўсё гэта не ёсць данінай толькі харызме, красамоўству, абаянню і талентам Абамы. І тым больш не ёсць праявай пакаяння за расавую дыскрымінацыю.

Гэта ўсё знешнія праяўленні, знакі тых супярэчлівых настрояў, якія спакваля выспявалі і назапашваліся за гады праўлення адміністрацыі Буша ў амерыканскім грамадстве, прычым у самых розных яго сацыяльных шыхтах. Сэнс і маштаб праблем, што паўсталі перад ЗША, дакладна вызначыў у сваёй моцнай, эмацыйна-рамантычнай і адначасова рэалістычна абвостранай, інаўгурацыйнай прамове Барак Абама. Гэта крызіс і сур'ёзнае аслабленне эканомікі з адпаведнымі сацыяльнымі стратамі. Гэта вайна «супраць шырокай сеткі гвалту і нянавісці». Гэта страх перад магчымым заняпадам краіны.

Незадавальненне можа быць дэтанатарам як расколу нацыі, так і яднання. Абама выявіў сябе палітыкам, які прапанаваў яднанне. Незалежна ад поглядаў, перакананняў, веравызнання. Дзеля перамен. Нацыя, што сфарміравалася на ідэалах свабоды і дэмакратыі, павярнулася да яго тварам і аддала даверам.

Збегам гістарычных абставін змена прэзідэнтаў сталася знакам змены эпох. Палітыкай адміністрацыі Буша завяршылася эпоха агульнага курса ЗША на сцвярджэнне сваёй дамінуючай ролі ў свеце, на барацьбу з рэжымамі зла метадамі пераважна сілавога ціску.

Абама паварочвае руль палітыкі на забеспячэнне дабрабыту кожнага амерыканца і нацыі ў цэлым. На ўплыўЗША сваім прыкладам, перакананнем у перамоўных працэсах, у супольнай працы, у саюзах з іншымі краінамі і народамі. Але не адмаўляе ні пераемнасці з ранейшай палітыкай Амерыкі, скіраванай на барацьбу з фашызмам, камунізмам і новымі пагрозамі, на апрабаваных прынцыпах свабоды і дэмакратыі.

«Таму я кажу, — прагучала ў прамове, — усім іншым народам і ўрадам, якія глядзяць на нас сёння… Ведайце, што Амерыка з'яўляецца сябрам кожнага народу і кожнага чалавека, жанчыны і дзіцяці, якія імкнуцца да мірнай і годнай будучыні, і што мы гатовыя зноў павесці вас за сабою».

Абвешчаны Абамай палітычны курс ёсць па сутнасці курс, які грунтуецца на базавых прынцыповых каштоўнасцях у спалучэнні з прагматычнымі запатрабаваннямі часу. Яго ж словы «падрыхтаваць краіну да новай эпохі» можна вызначыць як лозунг, што акрэслівае маштаб праблем і задач, але разам з тым і меру адказнасці новага прэзідэнта.

У змене стратэгічных акцэнтаў заключаецца і шанец для Беларусі. І першы крок да ўладкавання ўзаемаадносін са Злучанымі Штатамі, які неабходна і можна зрабіць у гэтым накірунку, на паверхні — даць зялёнае святло на работу амбасады ЗША ў Беларусі ў поўным складзе, без усялякіх папярэдніх умоў і патрабаванняў. І тут ужо няма розніцы, як гэта будзе зроблена — намаганнямі групы тэхнакратаў ці кімсьці асабіста. Тым больш, што для гэтага кроку ёсць добрая падстава: адміністрацыя Буша ў свой час не адказала на высылку большасці амерыканскіх дыпламатаў з нашай краіны разрывам дыпламатычных адносін. Не па слабасці, а з самапавагі да сябе як да вялікай дзяржавы, з павагі да сваіх ідэалаў.

Ідэалы — незалежнасці, свабоды, дэмакратыі — аднолькавыя і для малых краін, і для вялікіх, а таму паважаюцца ўсімі (акрамя дыктатарскіх). Не губляць пачуцця ўласнай годнасці, але і не пляжыць, не выстаўляць сябе на агульнае пасмешышча ваяўнічай рыторыкай ні ў чый бок — годная пазіцыя для малой дзяржавы. І найбольш выгодная для яе народа.



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ

**У Брэсце пачаліся работы па стварэнні музея гарадской яўрэйскай абшчыны.**

Як паведаміў старшыня праўлення абшчыны Барыс Брук, гэта будзе першы такі музей у абласных цэнтрах Беларусі. Створаны савет, куды ўвайшлі вучоныя-гісторыкі і актывісты абшчыны, якія будуць кіраваць зборам і сістэматызацыяй матэрыялаў. Дасланы звароты яўрэям, выхадцам з Брэста, якія жывуць за мяжой, з просьбай даць фотаздымкі і дакументы для будучага музея.

«Мы хочам паказаць гісторыю абшчыны праз лёсы канкрэтных людзей. У аснову музея будзе пакладзена дакументальная выстава «Яўрэі Брэста», якая пачала ствараца шэсць гадоў таму Брэсцкім абласным культурна-асветным цэнтрам «Халакост», — зазначыў Б. Брук.

Плануецца, што музей будзе адкрыты ў памяшканні гарадской яўрэйскай абшчыны. Асобныя яго раздзелы будуць прысвечаныя славутым ураджэнцам Брэста, у прыватнасці, вядомаму палітычнаму дзеячу, які стаў ля вытокаў стварэння Дзяржавы Ізраіль, лаўрэату Нобелеўскай прэміі міру Менахему Бегіну, доктару філасофіі і матэматыкі, асістэнту, паплечніку і сааўтару шэрагу навуковых работ Альберта Эйнштэйна — Якаву Громеру, першаму яўрэю ў Беларусі, які абараніў дысертацыю на ступень доктара медыцыны (1743 год), Мееру Абрагамовіцу.

### ГОМЕЛЬ

**Адміністрацыя гомельскага палацава-паркавага ансамбля звярнулася да гараджан з просьбай зрабіць унёсак у набыццё новага кола агляду.**



Стары атракцыён знаходзіўся ў аварыйным стане і быў дэмантаваны каля двух гадоў таму.

Як паведаміў генеральны дырэктар палацава-паркавага ансамбля Алег Рыжкоў, кошт новага кола агляду складае прыкладна 2 млн. еўра. Яно мае вышыню 54 метра і будзе ў паўтара разы большае за стары атракцыён. Такім чынам, адпачывальнікі змогуць разглядзець не толькі старую частку горада, але і новыя мікраёны.

«Дзяржаўны бюджэт не зможа ўнесці столькі грошай на кола агляду, таму мы звяртаемся да жыхароў горада, кіраўнікоў прадпрыемстваў з просьбай дапамагчы ў набыцці любімага гамяльчанамі атракцыёна. Папярэдне мы праводзілі апытанне гараджан, многія падтрымліваюць ідэю. Раней гараджане бралі ўдзел у рэканструкцыі палаца Румянцавых і Паскевічаў, аплаціўшы каля 30 працэнтаў кошту работ», — падкрэсліў А. Рыжкоў.

Ахвяраванні ўжо можна пералічваць на дабрачынны рахунак. Прыватным асобам і супрацоўнікам прадпрыемстваў, якія зробяць значны ўнёсак у набыццё кола агляду, абяцаныя льготы і бясплатныя білеты на катанне. Пастаўшчык пакуль не выбраны, але дырэктар гісторыка-культурнай установы заўважыў, што найбольш якасна такія атракцыёны вырабляюцца ў Італіі.

### БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

**У Брэсцкай вобласці ў 2009 годзе плануецца адкрыць аддзяленне медыка-сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў па зроку.**



Як паведаміў старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» Міхаіл Антоненка, разглядаюцца варыянты, дзе будзе створана такое аддзяленне. Сярод іх базы Брэсцкага эксперыментальнага вучэбна-метадычнага цэнтра, санаторыяў «Белая Вежа» (Камянецкі раён), «Бярэсце» (Брэсцкі раён).

Плануецца, што па 10 інвалідаў з усёй вобласці будуць прыязджаць у аддзяленне на тэрмін ад трох тыдняў да месяца. За гэты час яны пройдуць спецыяльную праграму паглыбленай сацыяльна-бытавой і медыцынскай рэабілітацыі.

«Асаблівую ўвагу мы будзем надаваць людзям, якія нядаўна страцілі зрок. Гэта дазволіць ім хутчэй адаптавацца да новых умоў жыцця, больш паспяхова інтэгравацца ў грамадства, працаўладкавацца», — сказаў М. Антоненка.

Паводле яго слоў, гэта будзе ўжо трэцяе ў рэспубліцы аддзяленне медыка-сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў па зроку. Раней яны былі створаны ў Мінскай і Віцебскай абласцях.

**Паводле БелаПАН**

---

АДМОВА

# ПАМЯШКАННЯ ДЛЯ СХОДУ НЯМА

**Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы Беларусі не могуць знайсці памяшканне для правядзення сходу ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў за змяненне выбарчага заканадаўства, які запланаваны на 25 студзеня.**

Сустаршыня АДС лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька паведаміў, што атрыманы адказы ад пяці арганізацый Мінска, у якіх прасілі выдзеліць памяшканне. «Усе адказы адмоўныя. У асноўным ідуць спасылкі на правядзенне ў гэты дзень спартыўных або культурных мерапрыемстваў», — сказаў ён.

Лябедзька лічыць, што «наўрад ці АДС удасца атрымаць пазітыўны адказ ад іншых арганізацый». «Улады не зацікаўлены ў рэалізацыі нашай ініцыятывы. Яны хочуць поўнасцю кантраляваць дыялог па змяненні выбарчага заканадаўства, калі ён усё ж такі пачнецца», — падкрэсліў ён.

Палітык таксама паведаміў, што 21 студзеня адбудзецца пасяджэнне прэзідыума палітрады АДС, на якім пры адсутнасці дазволу на правядзенне сходу ініцыятыўнай групы «будзе прынята калі не прававое, дык палітычнае рашэнне».

У ініцыятыўную групу АДС па зборы подпісаў за змяненне выбарчага заканадаўства ўваходзяць больш за 800 чалавек.

Канчатковы варыянт законапраекта аб змяненнях і дапаўненнях у Выбарчы кодэкс з тлумачальнай запіскай і параўнальнай табліцай перададзены ў Адміністрацыю прэзідэнта і БДІПЧ АБСЕ.

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, у прыватнасці, прапаноўваюць адмяніць або істотна абмежаваць датэрміновае галасаванне; дакладна замацаваць правы палітычных партый, якія бяруць удзел у выбарах, мець сваіх прадстаўнікоў ва ўчастковых і акруговых камісіях; выкласці тэрмін «удзел у выбарах» у новай трактоўцы, што прадугледжвае вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты на падставе рашэння рабочых органаў партый, а не з'езда і г. д.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй, права заканадаўчай ініцыятывы належыць грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці не менш за 50 тысяч чалавек.

**Паводле інфармацыі АДС**

---

ЛІСТ

# АФГАНЦЫ ЗВЯРНУЛІСЯ ДА ЎЛАДЫ

**Напярэдадні 20-годдзя заканчэння вайны ў Афганістане і «Дня абаронцы Айчыны і Узброеных сіл РБ» сустаршыні арганіцыйнага камітэта па стварэнню незалежнага ГА ветэранаў баявых дзеянняў «Абаронца Айчыны» Алег Волчак, Мікалай Аўтуховіч і Аляксандр Камароўскі звярнуліся з лістом да Аляксандра Лукашэнкі і Сяргея Сідорскага.**

У лісце адзначаецца, што зараз беларуская дзяржава негатыўна ставіцца да тых, хто ў свой час выконваў «інтэрнацыянальны доўг»: сацыяльныя гарантыі зменшаны настолькі, што гэта робіць іх несупастаўляльнымі з гарантыямі ў іншых краінах СНД, адсутнічае элементарная павага да гэтай катэгорыі грамадзян з боку дзяржаўных чыноўнікаў, у афганцаў адсутнічае афіцыйны статус «удзельніка вайны».

У сувязі з гэтым Волчак, Аўтуховіч і Камароўскі адмаўляюцца ад юбілейнай узнагароды ў гонар 20-годдзя вываду Савецкіх войскаў з Афганістана і патрабуюць ад уладаў: заканадаўча зацвердзіць статус удзельніка вайны для ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых краін; выдаць пасведчанні ўдзельніка вайны дзяржаўнага ўзору, вярнуць ільготы ўдзельнікам вайны ў Афганістане і сем'ям загінулых і памерлых у поўным аб'ёме, дапрацаваўшы іх, каб яны суадносіліся хаця б са стандартамі СНГ; а таксама неўмяшальніцтва дзяржавы ў справы грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў.

---

РЭГІСТРАЦЫЯ

# ТРЭЦІ СЕКТАР ХОЧА ЛЕГАЛІЗАВАЦЦА

Вольга ХВОІН

**Юрысты адзначаюць паляпшэнне сітуацыі ў галіне трэцяга сектару. НДА, натхнёныя першымі поспехамі, спяшаюцца легалізавацца.**

Адна з буйнейшых асацыяцый грамадскіх арганізацый Беларусі — Асамблея НДА, якая налічвае каля 250 грамадскіх арганізацый і ініцыятыў, рыхтуецца да рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі. У сакавіку запланавана правесці форум грамадскіх аб'яднанняў і актывістаў, падчас якога, верагодна, і будзе праведзены ўстаноўчы сход Асамблеі. Форум НДА мяркуецца правесці ў памяшканні Нямецкага адукацыйнага цэнтра (IBB). Адпаведная заяўка ўжо пададзеная ў адміністрацыю ўстановы. Сузаснавальнікам Нямецкага адукацыйнага цэнтра, акрамя пасольства Германіі ў Беларусі, з'яўляецца Мінгарвыканкам, таму ён непасрэдна ўплывае на прыняцце рашэнняў пра дазвол-забарону арэнды. Дазвол на правядзенне сходу грамадскіх арганізацый у Мінску (па часе ён акурат супадае з «тэставым перыядам» для ўладаў Беларусі), а таксама рэгістрацыя Саюзу няўрадавых арганізацыяў — Асамблеі, будзе істотным індыкатарам пазітыўных зменаў.

Юрыст Юрый Чавусаў адзначае, што цяпер «справы з рэгістрацыяй грамадскіх арганізацый у Беларусі дэманструюць некаторае паляпшэнне. Рэзалюцыя Еўрапарламенту, якая патрабавала нармалізацыі становішча ў галіне няўрадавых арганізацый, у прынцыпе, спрацавала. Зарэгістраваны рух "За свабоду", на працягу двух год запар колькасць рэгістрацый павялічылася на сотні. Па беларускіх мерках, гэта шмат. Але гэта пакуль не прывяло да ўстойлівага змянення заканадаўства. Улады ў межах дзеючага заканадаўства то падціскаюць гайкі, то паслабляюць. Цяпер мы ў перыядзе «адлігі», і трэба дамагацца, каб гэтыя паслабленні былі замацаваныя інстытуцыянальна, то бок правам, чым змяніўся парадак рэгістрацыі».

Таксама пра свой намер у бліжэйшы час паспрабаваць зарэгістраваць грамадскую арганізацыю паведаміў старшыня праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі. У нядзелю 18 студзеня ў Мінску адбыўся ўстаноўчы сход грамадскага праваабарончага аб'яднання «Наша Вясна». Кіраўніком аб'яднання быў абраны праваабаронца, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі. Заснавальнікамі «Нашай Вясны» з'яўляюцца праваабаронцы, журналісты і грамадскія дзеячы з розных рэгіёнаў краіны, якія раней уваходзілі ў арганізацыю, ліквідаваную ўладамі па рашэнні Вярхоўнага суда Беларусі яшчэ ў кастрычніку 2003 года. Праваабарончы цэнтр «Вясна» пасля ліквідацыі спрабавалі зарэгістраваць тройчы, але Мінюст штораз знаходзіў прычыны для адмовы.

Спробы зарэгістраваць грамадскія арганізацыі, якія раней знаходзіліся ў «чорным спісе» дзяржавы, актывісты трэцяга сектара лічаць тэстам на лаяльнасць уладаў і гатоўнасць іх да дэмакратычных пераменаў у краіне.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ГУЧНЫ СЫХОД ВАЛЯНЦІНА ЕЛІЗАР'ЕВА

Генадзь КЕСНЕР

**Відаць, адной з самых адметных і скандальных падзеяў апошніх дзён стаўся гучны сыход з Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Валянціна Елізар'ева і яго жонкі Маргарыты Ізворкай-Елізар'евай, якая кiравала Тэатрам оперы. Як стала вядома, пакінуць тэатр у хуткім часе могуць і вядучыя салісты.**

У панядзелак, 19 студзеня, Валянцін Елізар'еў, Маргарыта Ізворская-Елізар'ева і некаторыя артысты распавялі журналістам на адмысловай прэс-канферэнцыі, што ж адбылося.

«З 19 студзеня я больш не працую ў тэатры, я стаў вольным мастаком. 12 студзеня я падаў на імя міністра культуры заяву аб звальненні, а 17 студзеня яна была задаволена, — кажа Валянцін Елізар'еў. — Сумна пра гэта казаць, але я ў мінулыя выходныя вывез з тэатра свой архіў, рэчы. Ніхто з кіраўнікоў Міністэрства культуры — ні міністр Матвяйчук, ні яго першы намеснік Рылатка, ні часовы выканаўца абавязкаў дырэктара тэатра Пышной не сказалі мне нават «дзякуй», хоць я 36 гадоў адпрацаваў у гэтым тэатры, у гэтай трупе».

Па словах Елізар'ева, развіталіся з ім толькі артысты, якія і сёння працягваюць абараняць свайго настаўніка і цяпер ужо былога кіраўніка.

Прычыну свайго сыходу Майстар патлумачыў тым, што выконваць абавязкі дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Міністэрства культуры прызначыла іншага чалавека, а Елізар'еву прапанавалі быць толькі мастацкім кіраўніком Тэатра балета. «Але кіраўніком балета я быў яшчэ ў 1973 годзе», — падкрэсліў Елізар'еў. Зараз кіраваць балетам Міністэрства культуры прызначыла народнага артыста Беларусі Юрыя Траяна.

Як сказаў Валянцін Елізар'еў, яго практычна адхілілі ад усіх работ, звязаных з рэканструкцыяй тэатра, якая, па словах ужо былога кіраўніка, «ідзе з вялікім скрыпам», а «заложнікамі некампетэнтнасці чыноўнікаў сталі артысты».

«Сарваны ўсе тэрміны заканчэння рамонту. Мы гэтыя тры гады правялі ў пыле, у брудзе, без цяпла, часам, без гарачай вады, але, як бы там ні было, выжылі, — адзначыў Елізар'еў. — Але я пакуль не бачу фіналу рэстаўрацыі. Не бачна завяршэння будаўнічых, мантажных, тым больш пусканаладачных работ. Зараз няма памяшканняў для рэпетыцый хору, аркестра. Будаўніцтва — гэта пастаяннае напружанне з прычыны бясконцых унутраных праблем, памылак архітэктараў, будаўнікоў, рэстаўратараў, інтрыг вакол афармлення. Ва ўсім гэтым прысутнічаюць дробныя асабістыя інтарэсы. А ў тэатры не павінна быць дробязей. Я тры гады штотыдзень кантраляваў усе працэсы будаўніцтва і рэканструкцыі, вывучаў кожную дэталь. Я хацеў, каб беларускі тэатр стаў еўрапейскім і сучасным. Але каб так было, трэба, каб на чале



Photo.ByMedia.Net

тэатра стаяла творчая асоба… А гаспадаркаю павінен займацца заўгас. Аднак у Міністэрства культуры, відаць, іншы погляд на будучыню тэатра. Тэатр бачыцца чыноўнікам нечым накшталт філіі міністэрства, і ім павінны кіраваць людзі, якім не знайшлося месца ў самім міністэрстве».

Валянцін Елізар'еў сказаў, што нават разумее, чаму і каму стаў няўгодным. «Я ўвесь час выступаў за якасць, сварыўся, калі рабілі што-небудзь не так, таму мяне хуценька прыбралі з усіх камісій па рэстаўрацыі, сталі рэзка адхіляць ад удзелу ў працэсе рэстаўрацыі, ад магчымасці ўплываць на прынцыпы кваліфікаваных рашэнняў, — адзначыў Елізар'еў. — Я семнаццаць гадоў працую дырэктарам — мастацкім кіраўніком Тэатра балета. Я кіраваў не толькі творчымі працэсамі, але быў і менеджэрам, імпрэсарыо. Аднак мае веды і досвед у новым тэатры не спатрэбіліся. Змірыцца з гэтым, не паважаць сябе і тэатр я папросту не магу. Я не хачу ўдзельнічаць у знішчэнні тэатра, якому прысвяціў усё сваё жыццё, таму і сышоў».

У сваю чаргу, артысты балетнай трупы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета звярнуліся да прэзідэнта і Міністэрства культуры з заклікам зрабіць усё магчымае, каб Валянцін Елізар'еў застаўся ў тэатры. Зварот акцёраў журналістам зачытала салістка тэатра Ірына Яромкіна. «Калі ў беларускім балеце не будзе Елізар'ева, то не будзе і самога беларускага балета, — гаворыцца ў звароце артыстаў. — У нашай краіне няма харэографаў і тэатральных менеджэраў такога ўзроўню, як Валянцін Мікалаевіч Елізар'еў. Ён без перавелічэння — чалавек-эпоха, знакавая фігура не толькі ў балеце, але і ва ўсёй нацыянальнай культуры».

Артысты адзначылі, што пад кіраўніцтвам Елізар'ева калектыў тэатра перажыў усе цяжкія часы — перабудову, нізкія заробкі, рэканструкцыю будынка — і захаваў высокі творчы патэнцыял. «А цяпер, калі рамонт будынка амаль завершаны, калі трупа паспяхова гастралюе за мяжою, мы можам пазбавіцца лідэра», — падкрэсліваюць артысты, якія ўсё яшчэ спадзяюцца, што Елізар'еў не пакіне тэатр.

Як заявіў агенцтву БЕЛТА міністр культуры Уладзімір Матвейчук, Мінкульт шкадуе пра рашэнне Валянціна Елізар'ева пакінуць тэатр і спадзяецца, што той зменіць сваё рашэнне. Па словах міністра, Мінкульт працяглы час вёў перамовы з Елізар'евым, прапаноўваў яму быць мастацкім кіраўніком тэатра, але ён бачыў сябе генеральным дырэктарам, таму падаў заяву пра сыход.

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета стаў трэцім сталічным тэатрам, які скаланулі скандалы. Дагэтуль існуюць праблемы ў Дзяржаўным музычным тэатры, дзе многія акцёры не могуць паразумецца з новым кіраўніцтвам. А вось у Купалаўскім тэатры, артысты якога прасілі Міністэрства культуры памяняць кіраўніцтва, і кіраваць якім цяпер будзе вядомы рэжысёр Мікалай Пінігін, праблемы, здаецца, вырашаны.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГЛЯДЗІЦЕ, ЯКІЯ ЛЮДЗІ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Людзі, менавіта людзі былі галоўнымі дзеючымі асобамі мінулага тыдня. Прычым здарылася тое, чаго даўно чакалі і не маглі дачакацца шмат год. І вось — яно здарылася!**

У Чарнігаве сустрэліся прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка. Гэтая сустрэча планавалася, бадай, з самага першага дня прэзідэнцтва Юшчанкі, з перамогі «памаранчавай рэвалюцыі» ў 2004 годзе. Цягам некалькіх гадоў яна адкладалася, адкладалася, адкладалася… І нарэшце, адбылася.

Адметна тое, што ні адзін, ні другі не прынялі запрашэння Мядзведзева і не паехалі ў Маскву на газавы саміт. Замест гэтага яны пачалі ўяўна «сябраваць супраць Расіі». На пачатку чарнігаўскай сустрэчы Лукашэнка ў прысутнасці журналістаў нагадаў пра прапанову прэзідэнта Украіны стварыць калідор Чорнае мора — Балтыйскае мора. «Мы гатовыя працаваць з вамі і з краінамі Балтыі ў гэтым кірунку», — сказаў ён.

Па словах Юшчанкі, у Чарнігаве была дасягнутая дамоўленасць пра аднаўленне экспарту украінскай электраэнергіі ў Беларусь і праз нашу краіну ў Балтыю, дзе пасля закрыцця Ігналінскай АЭС будзе дэфіцыт электрычнасці.

Наступны пункт супадзення інтарэсаў — газавая сфера. У мінулыя гады «Газпраму» ўдавалася цаной зніжак эфектыўна блакаваць каардынацыю дзеянняў Украіны і Беларусі. Гаворачы пра канфлікт гэтага года, Юшчанка падкрэсліў, што «ужо ніколі не будзе газавая палітыка такой, якой яна была да 1 студзеня 2009 года. Выйдуць усе з навукай: Украіна, Беларусь, Расія, Еўрасаюз. Мы больш такімі не будзем: бесклапотнымі, даверлівымі».

Лукашэнка падкрэсліў, што праект нафтаправоду «Адэса—Броды» не страціў сваёй актуальнасці для Беларусі. Карацей, сяброўства супраць Расіі квітнее і набірае моц. Калі, канешне, усе дамоўленасці будуць выкананыя. Застаецца толькі прыняць прапанову ўкраінскіх эканамістаў і скарэктаваць кошт на транзіт газа да 3–6 еўра за тысячу кубоў — еўрапейскі кошт транзіту.

Тым больш, што, паводле газеты *«Коммерсантъ»*, цана газу для Беларусі ў першым квартале складзе $240 за тысячу кубічных метраў. Сярэднегадавая цана на газ для Украіны будзе 235 долараў.

Яшчэ адзін чалавек тыдня, безумоўна, — новы амерыканскі прэзідэнт Барак Абама. 20 студзеня ён прынёс прысягу на прэзідэнцкую пасаду. Прамова Абамы некаторым чынам прыдатная і для Беларусі. У прыватнасці, Абама сказаў: «Наша эканоміка сур'ёзна аслаблена ў выніку сквапнасці і безадказнасці некаторых, а таксама з-за няздольнасці нас усіх зрабіць цяжкі выбар і падрыхтаваць краіну да новай эпохі. Прападаюць дамы, страчваюцца працоўныя месцы, разбураецца бізнес. Наша сістэма аховы здароўя занадта дарагая, шмат чаго не хапае нашым школам, і кожны дзень прыносіць новыя сведчанні таго, што тое, як мы спажываем энергію, узмацняе нашых супернікаў і пагражае нашай планеце… Менш падлеглае вымярэнню, але не менш глыбокае — аслабленне даверу па ўсёй нашай краіне».

Пагадзіцеся, ну пра Беларусь сказана! Здаецца, таму беларускія эксперты і палітолагі на поўным сур'ёзе разважаюць пра тое, што Беларусі на прэзідэнцкіх выбарах 2011 года патрэбен «свой Абама». Але яшчэ невядома, хто на сябе прымерыць імідж «энергічнага палітыка новай генерацыі».

Пакуль апазіцыя шукае, улада, здаецца, ужо знайшла. Прынамсі, з тэлефанаванняў на радыё «Свабода» адна слухачка выказала думку, што праўладным кандыдатам будзе спадарыня Наталля Пяткевіч, — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Дасведчаная і сімпатычная жанчына, юрыст, «малады палітык». Гэта вам не апазіцыянеры, якія па дзесятку год сядзяць на кіроўных пасадах і цудоўна могуць патлумачыць, чаму яны ў чарговы раз прайгралі «бітву за электарат».

Яшчэ адзін чалавек выйграў прыз ад лёсу на гэтым тыдні. Увечары панядзелка шляхам глядацкага галасавання пасля фіналу беларускага конкурсу «Еўрафэст» было вырашана, што прадстаўляць нашу краіну на «Еўрабачанні» будзе Пётр Ялфімаў. Ён перамог з немалым адрывам: за яго прагаласавалі 11 475 гледачоў. Другое месца заняла Гюнеш (7 949 галасоў), трэцяе — праект «Litesound і Дакота» (4 385). Чацвёртае месца ў гурта «Вецер у галаве» (2 804). Апошняе месца ў Дамінікі (1 225 галасоў).

У інтэрнэце з-за гэтай перамогі адразу ж узнік скандал. Сеціўныя крыніцы сцвярджаюць, што Ялфімава выбралі пераможцам сёлетняга адбору на «Еўрабачанне» задоўга да фінальнага канцэрту. Быццам бы дыплом Ялфімава як пераможцы адбору на «Еўрабачанне» быў апублікаваны ў інтэрнэце задоўга да сканчэння "галасавання».

Але гэта, маем надзею, не сапсуе Пятру свята. Бо такія чуткі пра фальсіфікацыю вынікаў галасавання распаўсюджваюцца пры кожным адборы нашых кандыдатаў на «Еўрабачанне». Перамажы Гюнеш — і яе б таксама абвінавацілі ў фальсіфікацыях. Такія скандалы ўзнікаюць настолькі рэгулярна, што ўжо падаюцца звыклым і заезджаным піяр-ходам з боку самога выканаўцы.

ВЫБАРЫ

# У ПРЭЗІДЭНТЫ АХВОЧЫЯ

Вольга ХВОІН

**Цягам апошняга тыдня прадстаўнікі трох палітычных плыняў апазіцыі заявілі пра свой намер вылучацца ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта на наступных выбарах. Па сутнасці рэалізацыя ідэі пра адзінага кандыдата ад апазіцыі пад вялікім пытаннем. З аднаго боку, палітыкі заяўляюць пра пэўную кансалідацыю і неабходнасць вылучаць адзінага кандыдата, з другога — назіраюцца памкненні апярэдзіць сваіх калег і крыху «пацягнуць на сябе коўдру». Наступныя прэзідэнцкія выбарах мусяць адбыцца не пазней 8 лютага 2011 года. Але многія эксперты схіляюцца да меркавання, што выбары кіраўніка дзяржавы сумесцяць з выбарамі дэпутатаў у мясцовыя Саветы напрыканцы 2010 года. Калі так, то да галоўнай палітычнай кампаніі засталося не так шмат часу, і спадарам з вялікімі амбіцыямі варта варушыцца.**

## Аптымістычныя спадзяванні, туманны расклад

Першым пра намер балатавацца ў прэзідэнты заявіў Аляксандр Мілінкевіч — кандыдат на гэтую пасаду выбарчай кампаніі 2006 года. Выступаючы на прэс-канферэнцыі з нагоды рэгістрацыі руху «За свабоду», ён паведаміў, што збіраецца ісці на выбары, але калі пабачыць годнага кандыдата, якога падтрымае насельніцтва і які будзе мець рэальныя шанцы перамагчы, то «стане побач з ім і будзе працаваць на яго». Аляксандр Мілінкевіч сказаў, што шчыра верыў у магчымую перамогу на мінулых выбарах. І ў будучай кампаніі збіраецца працаваць напоўніцу, а не для «галачкі».

Разам з тым кіраўнік руху «За свабоду» адзначыў, што ў апазіцыі пытанне з вылучэннем адзінага кандыдата пакуль не вырашанае. Яго намеснік па руху Віктар Карніенка паведаміў, што АДС не гатовыя да грунтоўнага абмеркавання гэтага пытання: «У Аб'яднаных дэмакратычных сілах пытанне пра абранне адзінага кандыдата здымаецца з разгляду падчас пасяджэнняў, яны проста не гатовыя зараз яго абмяркоўваць», — адзначыў намеснік Мілінкевіча. Але паабедзь: нягледзячы ні на што, рух будзе «актыўна працаваць над стварэннем ініцыятыўнай групы Аляксандра Мілінкевіча».

Экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта лічыць верагодным, што на наступных выбарах апазіцыйны блок будуць прадстаўляць некалькі кандыдатаў, якія пойдуць «у народ» з рознымі ідэямі адносна будучыні Беларусі. «Магчымы трыкутнік кандыдатаў: прадстаўнікі дэмсіл, наменклатуры і Расіі. Малаверагодна, што Расія падтрымае цяперашняе кіраўніцтва», — адзначыў палітык. Сам Аляксандр Мілінкевіч упэўнены, што незалежная Беларусь у межах саюзнай дзяржавы з Расіяй немагчымая. «Гэта разнапланавыя краіны з рознымі тэрыторыямі, эканомікай», — патлумачыў ён сваю пазіцыю. Паводле палітыка, узаемаадносіны з усходняй дзяржавай-суседкай мусяць будавацца па прынцыпу «калі тое не супярэчыць інтарэсам Беларусі».

Што тычыцца супольнай працы ў межах Аб'яднаных дэмакратычных сіл, то Мілінкевіч запэўніў, што сваіх калег па палітычнай дзейнасці лічыць не супернікамі, а партнёрамі. «Мы будзем удзельнічаць у дзейнасці АДС у той частцы, якая адпавядае нашым мэтам і каштоўнасцям», — адзначыў Аляксандр Мілінкевіч.

У нядзелю 18 студзеня Аляксандр Мілінкевіч наведаў Сойм партыі БНФ. Там ён падзяліўся сваімі меркаваннямі як адносна будучыні АДС, так і прэзідэнцкай кампаніі. Варта адзначыць, што ў словах палітыка з'явіліся новыя акцэнты, якіх падчас сустрэчы з журналістамі за колькі дзён да гэтага не назіралася. У прыватнасці Мілінкевіч адзначыў, што захаваць Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы ў былых рамках немагчыма, і заклікаў рэфармаваць палітструктуру. Ён прапанаваў стварыць у АДС два блокі, якія маглі б вылучыць на прэзідэнцкія выбары двух кандыдатаў: аднаго праўсходняга, другога прабеларускага і арыентаванага на еўрапейскія каштоўнасці.

Асоба Аляксандра Мілінкевіча вартая ўвагі хаця б таму, што пасля паразы 2006 года ён не сышоў з палітычнай сцэны, а працягнуў сваю дзейнасць, скарыстаўшы свае сувязі і статус у еўрапейскіх структурах на карысць Беларусі. Ён пазнавальны ў грамадстве і мае сваіх прыхільнікаў. Зарэгістраваны рух «За свабоду» дазволіць легальна працаваць з насельніцтвам (наколькі тое магчыма ў нашай краіне) задоўга да афіцыйнага старту выбарчай кампаніі. Разам з тым лёгкі флёр няўдачы 2006 года нікуды не дзеўся і будзе цягнуцца за кандыдатам. Рух «За свабоду», у межах якога актыўна працуе Аляксандр Уладзіміравіч, гуртуе вакол сябе не столькі палітыкаў, колькі грамадскіх актывістаў трэцяга сектару, хаця Мілінкевіч і гаворыць, што палітычныя справы ім не чужыя. Калі станецца так, што Аляксандр Мілінкевіч не атрымае статус «адзінага» і падтрымку іншых палітыкаў і, адпаведна, іх рэсурсы, то перамагчы, абапіраючыся толькі на грамадскае плячо, наўрад ці атрымаецца.



Віталь Рымашэўскі



Аляксандр Мілінкевіч



Лявон Баршчэўскі

## З хрысціянскімі каштоўнасцямі

Аргкамітэт па стварэнні партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя збіраецца вылучыць аж трох кандыдатаў на прэзідэнцкую выбарчую кампанію. Адзін з іх ужо вядомы — гэта сустаршыня аргкамітэта Віталь Рымашэўскі. Віталю Рымашэўскаму 33 гады. Жанаты. Працаваў менеджэрам у выбарчай кампаніі Мілінкевіча, удзельнічаў у парламенцкіх выбарах, праваслаўны. Асобы двух іншых кандыдатаў будуць названыя падчас адмысловага сходу, які адбудзецца пасля ўстаноўчага з'езду партыі, што прызначаны на 28 лютага. Заяўкі на арэнду памяшкання для правядзення з'езду пададзеныя ў ДК МАЗ, ДК Трактарнага завода, Дом афіцэраў і Палац Рэспублікі. Сустаршыні БХД настроеныя рашуча і паабяцалі правесці з'езд на плошчы, калі ім не дазволяць арэндаваць памяшканне.

Кіраўніцтва БХД заявіла, што сваіх кандыдатаў у прэзідэнты можа зняць на карысць больш моцнага палітыка ад правых сіл. Фактычна не хаваецца, што асноўная мэта кампаніі — пашырэнне ідэй Беларускай хрысціянскай дэмакратыі сярод насельніцтва. Для палітычных колаў заява пра ўдзел у выбарах мае хутчэй статусны характар. Усё ж БХД — структура, якая да канца не сфарміравалася і шырокай вядомасці ў краіне не мае.

На жаль, адзін з найбольш актыўных і харызматычных палітыкаў сённяшняй Беларусі, сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Павел Севярынец у бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах удзельнічаць не зможа — пакуль не падыходзіць па ўзросту. Між іншым, яго досвед палітычнай дзейнасці і апантанасць сваёй справай маглі б прадэманстраваць цікавую палітычную кампанію.

Пабачым, якіх асобаў кіраўніцтва БХД назаве пазней у якасці яшчэ двух прэтэндэнтаў на прэзідэнцкі фатэль. Але хочацца спадзявацца, што ўласныя амбіцыі не будуць засціць вочы, і ў выпадку чаго хрысціяне і дэмакраты зробяць свой унёсак на карысць агульнай мэты.

## Фронт ірвецца ў бой

Не ўтойвае свайго намеру балатавацца на пасаду прэзідэнта аксакал і аўтарытэт айчыннай палітыкі, філолаг, перакладчык, грамадскі дзеяч і проста старшыня Партыі БНФ і грамадскага аб'яднання БНФ «Адраджэнне» Лявон Баршчэўскі. На апошнім Сойме партыі ён паведаміў, што, магчыма, у красавіку сыдзе са сваёй пасады, каб заняцца менавіта выбарчай кампаніяй. А магчыма, і не сыдзе. Варыянты абдумваюцца. Лявон Пятровіч — чалавек, безумоўна, паважаны. Але прыгадваецца, што на апошнім з'ездзе партыі БНФ ён без асаблівага імпэту пагадзіўся шчыльна заняцца палітыкай, каб ўратаваць партыю ад расколу. Таму яго кандыдатура на ўдзел у выбарчай кампаніі сякія-такія пытанні выклікае. Калі ж палітык насамрэч наважыцца кінуцца ў палітычны бой, то поспехаў яму і падтрымкі паплечнікаў.

На цяперашнім этапе вылучэння ў кандыдаты на першае месца ў кіраўніцтве краіны можна рабіць толькі агульныя прагнозы і здагадкі: кола прэтэндэнтаў не акрэсленае, пытанне пра «адзінага» не вырашанае. Пакуль маўчаць лідэр камуністаў Сяргей Калякін, нічога не заявіў афіцыйна старшыня арганізацыі прадпрымальнікаў «Перспектыва» Анатоль Шумчанка, хаця прызнаваўся, што пэўныя памкненні мае, не названыя кандыдаты ад сацыялдэмакратаў. Пагаворваюць, што і некаторыя маладыя і амбітныя палітыкі таксама выношваюць свае славалюбівыя планы. Як ні раскладзецца палітычны пасьянс, галоўнае, каб яго фігуры не паўтарылі памылкі мінулых кампаній: спазненне ў тэрмінах, в					ажданне са старымі ідэямі, слабую арганізацыю працу.

КАМЕНТАР

### Уладзімір Роўда, палітолаг:

— Яшчэ на восень 2008 года можна было лічыць, што ніякіх кардынальных зменаў на будучых прэзідэнцкіх выбарах мы не пабачым. Але цяпер мы ўлічваем пачатак лібералізацыі, здзейсненыя крокі ў гэтым накірунку і тое, што сапраўды нейкі працэс рэфармавання ці павярхоўнай адаптацыі працэдуры выбараў і палітычнай дзейнасці можа адбыцца. У такім выпадку ў 2011 годзе сітуацыя палепшыцца. Але гэта пакуль толькі мары. Нешта грунтоўнае можна будзе сказаць пасля красавіка, бо пакуль нічога, акрамя дэкларацый і зваротных крокаў (то бок таго, што можна хутка вярнуць назад), няма. Мы мусім пачакаць з высновамі да таго часу, пакуль стане відавочна, ці пачаўся нейкі рух, ці ўсё засталося на ўзроўні гульні. На сёння непадрыхтаванасць характэрная не толькі для рэжыму, але і для апазіцыі. Я не бачу ўмоў для сапраўднага аб'яднання дэмакратычных сілаў, таму шанцы на вылучэнне адзінага кандыдата нават меншыя, чым на папярэдніх выбарах.

Мэтазгоднасць вылучэння адзінага кандыдата залежыць ад таго, хто ім будзе. Відавочна, што шанцы на нейкую перамогу дзеючага кіраўніка дзяржавы ёсць толькі ў адзінага, прычым у тым выпадку, калі ён будзе прадстаўлены ў грамадзянскім сэнсе. Як бы не імкнуўся АДС вылучыць сваю кандыдатуру, у палітыка актыўнай часткі грамадства ў любы момант можа з'явіцца свой лідэр.

Што тычыцца асобаў, якія публічна абвясцілі пра свой намер балатавацца ў прэзідэнты, я думаю, што шанцаў яны не маюць. Чыннікі таго, што яны зрабілі, розныя. Лявон Баршчэўскі, напрыклад, знаходзіцца на шляху да інтэргацыйных працэсаў, гэта заява — напамін пра тое, што прыйшоў час абмяркаваць пытанне сістэмна. Для Аляксандра Мілінкевіча вылучэнне хутчэй з'яўляецца рытуальным. Наконт Віталя Рымашэўскага я хачу ўвогуле ўстрымацца ад нейкіх каментараў.

ЭНЕРГЕТЫКА

# ЗА СПІНАЙ ВЯЛІКАГА СУСЕДА

Вольга ХВОІН

**На саміт у Маскве, дзе вырашаўся фінал газавай драмы паміж Расіяй і Украінай, ні кіраўнік Украіны Віктар Ючшанка, ні лідэр Беларусі Аляксандр Лукашэнка не прыехалі. Затое сустрэліся праз два дні 20 студзеня ў Чарнігаве. Без маскоўскіх пасярэднікаў. Палітычны ледавік паміж лідэрам памаранчавай рэвалюцыі і аўтарам канцэпцыі беларускай «стабільнасці» растапілі эканамічныя інтарэсы.**

Сустрэча кіраўнікоў дзвюх дзяржаў праходзіла спачатку ў вузкім, затым у пашыраным фарматах. Па выніках перамоў бакі падпісалі шэраг сумесных дакументаў. Найперш гэта Мемарандум аб супрацоўніцтве ў энергетычнай сферы, Консульская канвенцыя паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай, а таксама мемарандум паміж урадамі і нацбанкамі Беларусі і Украіны аб выпрацоўцы сістэмы мер па інтэнсіфікацыі двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Відавочна, што да супрацы дзяржавы падштурхнула менавіта Расія са сваёй агрэсіўнай і непрадказальнай знешняй энергетычнай палітыкай.

Пытанню супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі быў аддадзены ладны кавалак перамоў. У выніку стала вядома, што Лукашэнка заявіў пра намер аднавіць закупку ўкраінскай электраэнергіі. Беларускі лідэр падкрэсліў, што ў выпадку неабходнасці магчыма будаўніцтва новых нітак ліній электраперадачы для транзіту праз Беларусь электраэнергіі ў краіны Балтыі, або для набыцця электраэнергіі ў вялікіх аб'ёмах для самой Беларусі. На другі дзень пасля перамоў на вышэйшым узроўні намеснік міністра энергетыкі Беларусі Эдуард Таўпянец паведаміў афіцыйнаму інфармацыйнаму агенцтву БЕЛТА, што бакі працуюць над узгадненнем умоў пастаўкі ўкраінскай электраэнергіі. Але кантракт пакуль не падпісаны. Эдуард Таўпянец адзначыў, што імпарт электраэнергіі з Украіны можа быць адноўлены толькі на ўмовах, якія будуць задавальняць беларускі бок.

Нагадаю, у 2005 годзе былі тэхнічна адноўленыя і падрыхтаваныя для паставак украінскай электраэнергіі ў Беларусь міждзяржаўныя лініі электраперадачы «Чарнігаў—Гомель» і «ЧАЭС—Мазыр», якія доўгі час да гэтага не выкарыстоўваліся. У 2006 годзе Беларусь імпартавала 2,5 млрд. кВт/г электраэнергіі з Украіны, у першым паўгоддзі 2007 года — каля 800 млн. кВт/г. Пасля пастаўкі электраэнергіі спыніліся, бо бакі не дамовіліся па кошце. Лініі электраперадачы «Чарнігаў—Гомель» і «Чарнобыльская АЭС—Мазыр» могуць быць выкарыстаныя таксама для транзіту ўкраінскай электраэнергіі праз Беларусь у краіны Балтыі. Тэхнічныя пытанні праекту цяпер прапрацоўваюцца ДПА «Белэнерга» з літоўскім і латвійскім бокам. Сёлета Беларусь планавала імпартаваць да 5 млрд. кВт/г з Расіі.

Таксама на перамовах ішла гаворка аб праекце нафтаправода «Адэса—Броды». Лукашэнка адзначыў, што праз яго Беларусь зможа забяспечыць транзіт нафты ў краіны Балтыі і Польшчу, а перапрацоўку нафты на беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах дазволіць забяспечыць таннейшымі і якаснымі нафтапрадуктамі поўнач Украіны.

Эксперт у галіне энергетыкі Станіслаў Гусак лічыць гэты праект для Беларусі выгодным і своечасовым. «Трэба толькі, каб нафтаправод запрацаваў у рэверсным рэжыме. Калі гэта будзе зроблена, то мы атрымаем не толькі грошы за транспарціроўку нафты, сыравіну для сваіх заводаў, але і новыя працоўныя месцы», — адзначае эксперт. — Сёння ўжо зразумела, што размаўляць з Расіяй з яе азіяцкай палітыкай трэба на іншай мове. Я лічу, што нам неабходна развіваць транснацыянальную інфраструктуру ад Адэсы да Таліна і Вільні, добра было б стварыць нейкі саюз ці альянс спажыўцоў газу. Тады Расія вымушаная была б размаўляць не з кожным паасобку, а з цэльнай структурай, якая трымацца адзінай пазіцыі. Як добры варыянт, завозіць у марскія парты звадкаваны газ, і ўжо адтуль пастаўляць яго спажыўцам».

Акрамя энергетычнага складніку міждзяржаўных узаемаадносін, былі закрануты і палітычныя. На сустрэчы абмяркоўваліся праекты супрацоўніцтва з суседнімі дзяржавамі, у тым ліку ў рамках палітыкі Усходняга партнёрства. Паводле Лукашэнкі, абодва бакі могуць прапанаваць шэраг праектаў, якія цікавяць ЕС, выпрацаваць адзіныя з Еўрасаюзам падыходы. Лукашэнка падзякаваў Віктару Ючшанку за падтрымку, якую Украіна аказвае Беларусі на ўсіх узроўнях, у тым ліку ў дыялогу з Захадам. Кожны новы расійскі газавы скандал падсілкоўвае інтарэсы афіцыйнага Мінска ў заходнім накірунку.

Афіцыйныя паведамленні з сустрэчы ўкраінскага і беларускага лідэра насычаныя словамі, якія мусяць дэманстраваць узаемную любоў да скону дзён. «У аснове нашых адносін — узаемная павага, давер, даўняя сувязь сяброўства. У нас няма ніякіх рознагалоссяў з прэзідэнтам Украіны, няма пытанняў, якія выклікалі б раздражненне», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Між іншым, нязменны кіраўнік Беларусі на інаўгурацыю Віктара Ючшанкі ў свой час не паляцеў, спаслаўшыся на шчыльны працоўны графік, а ў адным са сваіх штогадовых пасланняў беларускаму народу недвухсэнсоўна выказаўся пра Украіну і яе кіраўніцтва азначэннем «бандытызм каляровых рэвалюцый».

ФІНАНСЫ

# КРЭДЫТАЎ СТАЛА МЕНШ

**Колькасць банкаў, якія крэдытуюць жыллё і аўтамабілі, скарацілася ў Беларусі да мінімуму. Пры гэтым рост працэнтных ставак па крэдытах працягваецца. Да такой высновы прыйшлі эксперты інтэрнэт-партала *Infobank.by* ў студзеньскіх рэйтынгах крэдытаў на нерухомасць і аўтамабілі.**

Адзначаецца, у прыватнасці, што на гэты час колькасць беларускіх банкаў, якія выдаюць крэдыты на куплю або будаўніцтва жылля, скарацілася да пяці. Тры найбуйнейшыя дзяржбанкі «Беларусбанк», «Белаграпрамбанк» і «Белінвестбанк» — выдаюць крэдыты толькі ў беларускіх рублях, прычым першы — толькі ў частцы будаўніцтва жылой нерухомасці.

Аднак, зазначаюць эксперты, «і гэты выбар можа быць толькі ўяўным, бо крэдыт выдаюць толькі ў залежнасці ад наяўнасці рэсурсаў у канкрэтным філіяле банка». Пры гэтым у мінскіх філіялаў рэсурсы з-за большага попыту з боку насельніцтва на крэдыты заканчваюцца значна хутчэй, чым у абласных гарадах. Камерцыйныя банкі «Прыёрбанк» і «Белросбанк» выдаюць толькі валютныя крэдыты.

Працэнтныя стаўкі па крэдытах таксама павяліччыліся. Эфектыўныя стаўкі па рублёвых крэдытах знаходзяцца ў дыяпазоне 20–26%, па валютных — 18,9–20,6%.

Зафіксавана таксама стойкая тэндэнцыя павелічэння мінімальнага даходу крэдытаатрымальніка, г. зн. патрабаванні да мінімальнага памеру заработнай платы патэнцыяльнага пазычальніка ў цяперашніх умовах не толькі не падаюць, а, наадварот, працягваюць расці.

Сітуацыя па крэдытах пастаянна мяняецца, а «павышэнне ставак па крэдыце ўжо з'яўляецца не выключэннем, а сумнай заканамернасцю». «Гэта гаворыць аб тым, што, разлічваючы ўзяць крэдыт на такі доўгі тэрмін і вялікую суму, варта ўсур'ёз паразважаць над уласнай плацежаздольнасцю ў перспектыве», — робяць выснову аналітыкі інтэрнэт-рэсурса.

У частцы аўтакрэдытавання *Infobank.by* самай галоўнай зменай адносна канца мінулага года называе далейшае павышэнне працэнтных ставак, якое закранула ў асноўным рублёвыя крэдыты. На гэты час стаўкі па іх скалаліся на ўзроўні 24–31% у беларускіх рублях. Па валютных крэдытах узровень ставак застаўся ранейшым — 17–20%. Колькасць беларускіх банкаў, якія выдаюць крэдыты на куплю аўтамабіляў, звузілася яшчэ больш. Цяпер усяго тры банкі — «Белросбанк», «Прыёрбанк» і «Альфабанк» — выдаюць іх у валюце. Крэдыты ў беларускіх рублях можна атрымаць у Банку ВТБ, «Белінвестбанку» і «БПС-Банку».

У цэлым, зазначаюць эксперты, на гэты час выбар праграм аўтакрэдытавання шмат у чым з'яўляецца безальтэрнатыўным. Крэдытаатрымальнік не можа разлічваць на шырокі выбар і вымушаны згаджацца з умовамі канкрэтнага банка. «І трэба сказаць, што сітуацыя з цягам часу не паляпшаецца», — рэзюмуюць аналітыкі інтэрнэт-рэсурса.

А пакуль аналітыкі разважалі, ААТ «Белаграпрамбанк» 19 студзеня на 4% павысіў стаўкі па крэдытах на спажывецкія патрэбы — з 20% да 24%.

Апрача таго, банк прыпыніў выдачу крэдытаў на куплю і будаўніцтва жылля. У банку не змаглі назваць тэрмін аднаўлення крэдытавання, зазначылі толькі, што стаўкі па дадзеным відзе крэдытаў таксама павялічаныя — для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаўка складае 21% супраць ранейшай 17%, для тых, хто не мае патрэбы, 24% супраць 20%. Афіцыйна ў банку гэта рашэнне не каментуюць, зазначаючы толькі, што ў цэлым «дадзеная сітуацыя для банкаўскай сістэмы краіны не новая».

Паводле БелаПАН

КАРУПЦЫЯ

# ХАБАРНІКІ Ў МУНДЗІРАХ І БАБРУЙСКАЕ ЧЫКАГА

Вольга ХВОІН

**Шэрагу службоўцаў Генеральнай пракуратуры высунутыя абвінавачванні ў карупцыйных скандалах. Пра гэта паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі генпракурор Беларусі Рыгор Васілевіч.**

## Хабарнічаюць

Ужо выдадзеная санкцыя на арышт былога начальніка аддзела ўласнай бяспекі Генеральнай пракуратуры Макарава, які падазраецца ў хабарніцтве. Злачынства было здзейснена ў 2007 годзе. На пасаду падазронага быў прызначаны новы чалавек — Аляксей Шыкунец. Генпракурор ахарактарызаваў новага супрацоўніка, як «маладога, дасведчанага і сумленнага супрацоўніка».

Таксама арыштаваны былы начальнік Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Анатоль Грамовіч. У адносінах да яго заведзеная крымінальная справа па частцы 3 артыкула 285 Крымінальнага кодэкса. Грамовіч падазраецца ў атрыманні хабараў, ухіленні ад выплаты мытных плацяжоў. «Пакаранне можа быць вельмі сур'ёзным», — заявіў генпракурор. Таксама ён паведаміў, што, магчыма, з Грамовічам у адной звязцы працавалі некалькі чалавек.

Што тычыцца справы супраць былога пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра, якога абвінавачваюць злоўжыванні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі, то генеральны пракурор абвергнуў закіды ў «кампанейшчыне» і заявіў, што расследаванне карупцыйных скандалаў — даўняя ініцыятыва Лукашэнкі. Нагадаю, кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка летась 13 лістапада на нарадзе па пытаннях эфектыўнасці мераў, якія прымаюцца для барацьбы з карупцыяй, даручыў генеральнаму пракурору пазбавіць ад займаемых пасадаў намесніка генпракурора Мікалая Купрыяна і пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра. У дачыненні да іх заведзеная крымінальная справа па факце злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі. Цяпер Снягір знаходзіцца пад вартай. Агулам, паводле інфармацыі Рыгора Васілевіча, колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў за апошнія пяць год скарацілася ў паўтара разы.

## П'юць і засільваюцца

Рыгор Васілевіч з задавальненнем адзначыў, што агульная крымінальная статыстыка палепшылася. Але колькасць злачынстваў непадрыхтаванага чалавека ўсё роўна ўражвае. Так, летась было зафіксавана 158 тысяч злачынстваў, а ў 2006 годзе — 191 тысяча, забойстваў — 645 у 2008 годзе і 961 у 2006-м. Скарацілася колькасць рабаўніцтваў, гвалтоўных нападаў. Між іншым, у вёсках забойстваў адбываецца ў тры з паловай разы больш, чым у гарадах. Большасць з іх здзяйсняецца ў нецвярозым стане. Сітуацыю з п'янствам у краіне генеральны пракурор лічыць крытычнай, бо 37,5 працэнта ўсіх правапарушэнняў людзі ўчыняюць пасля таго, як добра прыкладуцца да чаркі. Уражвае лічба самазабойстваў — дзве тысячы васемсот чалавек за год, і больш за палову з іх (65 працэнта) папярэдне напіліся.

Самымі крымінагеннымі раёнамі Беларусі ў разліку на дзесяць тысяч насельніцтва названы Бабруйскі, Полацкі, Віцебскі, Пухавіцкі, Брэсцкі і Аршанскі раёны, а таксама Цэнтральны раён горада Гомеля. Аж сем забойстваў было летась у невялікім Крупскім раёне.

З НАГОДЫ

# QUO VADIS?

Аляксей ХАДЫКА

**25 студзеня ў Маскве пачне працаваць Памесны сабор Рускай праваслаўнай царквы, а 26 студзеня распачнецца першы этап галасавання па кандыдатуры новага патрыярха РПЦ. Ён зменіць памерлага 5 снежня мінулага года нязменнага з 1990 года патрыярха Алексія II. Але ўжо зараз поўным ходам на некалькіх сайтах ідзе папярэдняе галасаванне — царква імкнецца не адрывацца ад эпохі.**

На сайце *www.patriarh2009.ru*, створаным прыхільнікамі месцазахавальніка патрыяршага прастола мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага Кірыла, апошні — бясспрэчны лідэр (71,7%, або 403 242 галасы на 21 студзеня). Яму далёка саступае другі па выніку мітрапаліт Кіеўскі Уладзімір (9,1%), які, між іншым, ужо дэкляраваў, што адмаўляецца балатавацца, бо «жадае прадстаць перад Госпадам 121-м мітрапалітам Кіеўскім, а не 16-м патрыярхам Маскоўскім і Усяе Русі». Сайт апанентаў Кірыла *www.pravaya.ru* хаця і паказвае вялікі працэнт яго праціўнікаў (44,4%), але таксама прызнае за ім пяршынства (37,9%). Як і сайт *www.zapatriarha.ru*, дзе ў Кірыла 35,7%. Праўда, тут нейкія забаўнікі з інтэрнэту ўвесь час напампоўваюць галасы японцу мітрапаліту Такійскаму і ўсяе Японіі Даніілу (43,2%), так што гаспадары гэтага вэб-рэсурсу ўвесь час змушаныя абнуляць вынікі апошняга. Сяродлідэраў сайта *www.patriarh2009.ru* таксама мітрапаліты Ювеналій, Філарэт і Клімент, але яны значна саступаюць мітрапаліту Кірылу.

750 удзельнікаў сабору з правам голасу выбіралі ва ўсіх епархіях РПЦ пераважна патаемным галасаваннем — у Маскву прыедуць прадстаўнікі епіскапства, манаства, кліру і міран. 15 студзеня іх спісы перададзены Мандатнай камісіі РПЦ. Памесны сабор выглядае больш прадстаўнічым за папярэдні: у ім упершыню бяруць удзел вылучэнцы ад Рускай замежнай царквы. Павялічана і квота манастыроў, напрасткі выбіраюцца ігумені жаночых кляштараў. Нават гучаць незадаволеныя галасы з-за вялікага прадстаўніцтва на саборы чынавенства і бізнесоўцаў-спонсараў РПЦ. «Цяжка было б уявіць у 1990-я гады партыйнага сакратара, які б з білетам КПСС у руцэ ірваўся на сабор», — дэкларуе дыякан Андрэй Кураеў, прапануючы не ператвараць сабор у «з'езд прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў» і «кірмаш мітусні». Ад Растоўскай епархіі ў Маскву едзе ўладальнік ААТ «Данскі тытунь» Іван Савідзі. Ад Барнаульскай і Алтайскай — старшыня праўлення фармацэўтычнага ТАА «Юніфарм» Юрый Ніжагародцаў. Бабруйск рэпрэзэнтуе старшыня камісіі па гандлі і прадпрымальніцтву гарсавета і ўладальнік фірмы па здачы ў арэнду офісаў «Ярабел» Ігар Баншчыкаў. Пра апошняга вядомы бабруйскі апазіцыянер і колішні калега Баншчыкава па гарсавеце Алесь Чыгір кажа: «Ён з добрай праваслаўнай сям'і. А яго сын вучыцца ў духоўнай семінарыі. Яго зацікаўленні — як бізнес, так і вера». А прэсавы сакратар Маскоўскай патрыярхіі Уладзімір Вігілянскі нагадвае, што ў большасці епархіяў галасаванне было таемным, і значную прысутнасць чынавенства і бізнесоўцаў тлумачыць «заганамі дэмакратыі». Сапраўды, ці маглі інтрыгі вызначыць вылучэнне ад Віцебскай епархіі бадай самай маладой дэлегаткі сабору студэнткі гістфаку Віцебскага ўніверсітэта і прыхаджанкі мясцовага храма Св. Георгія Любы Раеўскай?

Але звернемся да драматычнай гісторыі РПЦ апошніх год і месяцаў, якая апынулася ў фокусе грамадскай увагі пасля смерці шматгадовага патрыярха Рускай праваслаўнай царквы Алексія II. 79-гадовы кіраўнік царквы ачольваў РПЦ 18 год.

Па смерці Алексія II месцаахоўнікам патрыяршага прастола быў абраны 62-гадовы мітрапаліт Смаленскі і Калінінградскі Кірыл, старшыня аддзела знешніх сувязяў Маскоўскай патрыярхіі. 10 снежня Свяшчэнны сінод РПЦ вызначыў дату правядзення Памеснага сабора для абрання новага патрыярха. Памесны сабор з архірэяў, кліру і міран, насуперак царкоўнаму статуту, які патрабуе яго склікання кожныя 5 год для абмеркавання сітуацыі ў царкве і свеце, не склікаўся пасля абрання патрыярхам Алексія II у 1990 годзе.

Шмат якія СМІ, у тым ліку радыё «Свабода» (Кастусь Бандарук), называлі Алексія II «суперэчлівым патрыярхам». Час яго знаходжання на чале Рускай праваслаўнай царквы прыйшоўся на пераходны перыяд.

**Такім чынам, РПЦ у часы Алексія II перажывала няпросты перыяд, як, зрэшты, і іншыя цэрквы (хрысціянскія і не толькі) на тэрыторыі былога СССР**

Ставячы задачу адраджэння РПЦ найперш праз аднаўленне царкоўных структур і колькасці прыходаў, Алексій II не мог не ахвяраваць якасцю працэсу. Шансу вырвацца з-пад татальнага кантролю дзяржавы, зрабіцца свабоднай ад «кесара» ў РПЦ не заставалася. Не было і магчымасці асудзіць савецкі камунізм і бальшавіцкую практыку, якія прывялі да руйнавання царквы. Знакамітае пераўтварэнне Патрыярхам І Сінода ў дзяржаўнае міністэрства цалкам заняволіла іерархію РПЦ. Пазней савецкая ўлада канчаткова знішчыла яе, замяніўшы на нешта зусім іншае.

Алексій II быў вымушаны публічна падтрымаць спачатку Барыса Ельцына, а потым нават Уладзіміра Пуціна з Дзмітрыем Мядзведзевым (галасаваць за якога заклікалі простых прыхаджан). Горш за тое, былі ўхваленыя ганебныя ваенныя кампаніі ў Чачні. Кадравы гэбіст Пуцін раптам зрабіўся вялікім вернікам, жонка Мядзведзева Святлана пачала «рэгулярна бываць на імшах і падтрымліваць усялякія царкоўныя дабрачынныя акцыі».

Затое РПЦ атрымала выключную дапамогу дзяржавы, зноў зрабіўшыся галоўнай канфесіяй Расіі. Як адзначаюць свецкія наглядальнікі, падобным шляхам цеснага супрацоўніцтва з дзяржавай РПЦ пад кіраўніцтвам мітрапаліта Філарэта крочыць і ў Беларусі. Менавіта ў Беларусі прыняты максімальна выгодны для праваслаўнай царквы сярод краін постсавецкай прасторы закон пра рэлігіі. Няма і гаворкі пра ўплыў Канстанцінопальскага патрыярха (як ва Украіне), альбо Беларускай праваслаўнай (замежнай) царквы, рыхтуецца падпісанне канкардату (асаблівага пагаднення) паміж РПЦ і Беларускай дзяржавай.

Складанасці ўзаемадзеяння з іншымі хрысціянскімі цэрквамі — таксама адна з праблемных пазіцый РПЦ часоў Алексія II. Так і не адбылося прымірэння паміж Ватыканам і Масквой, а Маскоўскі патрыярх адкінуў усе прапановы пра магчымы візіт Папы Рымскага Яна Паўла II. Калі на месца Яна Паўла II быў абраны Бенедыкт XVI, у РПЦ уздыхнулі з палёгкаю. Маўляў, кожны будзе лепшы за паляка, пра што ў свой час выразна заявіў «Свабодзе» прыгаданы вышэй расійскі тэолаг айцец Андрэй Кураеў. Не пазбег абвінавачванняў у «празелітызме» на тэрыторыі кананічнага праваслаўя падчас свайго 16-гадовага служэння ў Маскве і Тадэвуш Кандрусевіч. Хаця, па ягоных словах, за гэты час толькі некалькі сотняў рускіх з праваслаўнымі каранямі перайшлі ў каталіцызм.

Адной з прычын абачлівага стаўлення да дзейнасці каталікоў у Расіі Алексія II была ўнутраная слабасць РПЦ і знешні характар рэлігійнасці большасці вернікаў. Каталікі параўнаўча больш энергічныя і ўпартыя, дынамічныя і сучасныя. Рэлігійнасць расіян, нават тых, хто быў хрышчаны ў царкве, вельмі часта абмяжоўваецца крыжыкам на грудзях.

З сацыялагічных даследаванняў у Расіі вынікае, «што хаця прыналежнасць да праваслаўя дэкларуе 70% расіянаў, аднак толькі 6% з іх рэгулярна ўдзельнічаюць у царкоўным жыцці. Толькі 27% вернікаў умеюць назваць хаця б адзін з дзесяці запаветаў, а ўсе дзесяць умеюць пералічыць толькі 2%. Пасты трымаюць меней чым 10% вернікаў, а 21% не памятае, калі прыступаў да Святога Прычасця (Еўхарыстыі). Ва ўмовах рэлігійнай свабоды вернікі не хлынулі ў храмы, і гэта не толькі вынік дзесяцігоддзяў атэізацыі. Ментальна застаючыся ў XIX стагоддзі, РПЦ не здолела стаць душапастырам для народу», — мяркуе радыё «Свабода».

Складаныя ўзаемаадносіны існуюць паміж РПЦ і старэйшай праваслаўнай патрыярхіяй у свеце — Канстанцінопальскай, паводле царкоўнай традыцыі «першай сярод роўных» у праваслаўных («Primus inter pares»). Асабліва гэта датычыць юрысдыкцыі над тымі цэрквамі ў замежжы, якія заснавала расійская царква. Праўда, Алексій II прывёў РПЦ да прымірэння з царквою ў замежжы, але пры гэтым не выканаў асноўнага патрабавання з боку замежнай царквы: пакаяння ў супрацоўніцтве з камуністычным рэжымам. Не правёў Алексій II і люстрацый сярод святарства з прычыны супрацоўніцтва з КДБ.

Такім чынам, РПЦ у часы Алексія II перажывала няпросты перыяд, як, зрэшты, і іншыя цэрквы (хрысціянскія і не толькі) на тэрыторыі былога СССР. Яго безумоўнай заслугай, як і мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, што лічыцца яшчэ адным верагодным кандыдатам на пераемніцтва ў патрыяршым пасадзе, можна назваць захаванне цэласнасці РПЦ і адноснага царкоўнага міру. Гэта асаблівa тычыцца Беларусі, дзе РПЦ традыцыйна з'яўляецца адной з дамінуючых хрысціянскіх цэркваў. Праўда, лічбы пра 75% яе паслядоўнікаў хутчэй адпавядаюць савецкай псеўданавуковай статыстыцы і ідэалогіі. Паводле іх, славянскасць поруч з гістарычнай праваслаўнасцю мацавала саюз трох асноўных рэспублік СССР. Дай Бог, каб усіх хрысціян Беларусі разам — праваслаўных, каталікоў і пратэстантаў — набралася працэнтаў 20–30.

Пералічым іншых прэтэндэнтаў на пасаду патрыярха РПЦ: усе яны ўваходзяць у склад Свяшчэннага Сінода, які аб'ядноўвае сем іерархаў. Кандыдат мусіць быць архірэем РПЦ, мець узрост не маладзей за 40 год, валодаць вышэйшай багаслоўскай адукацыяй і пэўны час кіраваць адной з епархій. Апрача мітрапалітаў Кірыла і Філарэта, усур'ёз разглядаюцца кандыдатуры мітрапаліта Круціцкага і Каломенскага Ювеналія, які кіруе найбольшай у Расіі (1013 прыходаў) епархіяй. Калі абранне мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага Кірыла можна будзе разглядаць як жаданне большасці Памеснага сабора бачыць РПЦ адчыненай навакольнаму свету, то перавага мітрапаліта Ювеналія трактуецца як знак «дзяржаўніцка-бюракратычнага» ўзмацнення структур РПЦ у будучыні. Наймалодшы з верагодных прэтэндэнтаў — 59-гадовы мітрапаліт Калужскі Клімент, які ў кароткі перыяд з 2003 года вырас з другіх роляў у адным з сінадальных аддзелаў да кіраўніка справамі Маскоўскай патрыярхіі. Яго характарызуюць як абаяльнага, адукаванага і інтэлігентнага чалавека, кандыдатура якога здольная задаволіць розныя групоўкі ў РПЦ.

Нагадаем, папярэднік Алексія II патрыярх Ціхан абіраўся простым выцягваннем жарабя з трох кандыдатур, зацверджаных Памесным саборам. Выбар Алексія II у 1990 годзе быў вынікам патаемнага галасавання ўсіх архірэяў, кліру і міран у два туры. Як пройдзе Памесны сабор 25–29 студзеня 2009 года? Засталося чакаць нядоўга.

А «Новы час» чакае пытанняў сваіх чытачоў да мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага экзарха Беларускай праваслаўнай царквы. Мы рыхтуемся да інтэрв'ю з мітрапалітам, пра якое нас прасілі чытачы пасля з'яўлення ў газеце гутаркі з галоўным каталіцкім экзархам Беларусі, арцыбіскупам Мінскім і Магілёўскім Тадэвушам Кандрусевічам. Прапануем чытачам праз газету задаць пытанні мітрапаліту (тэл. 968-79-73 або 651-21-12, або e-mail p_university@open.by ці alstep@tut.by). У хуткім часе мы перададзім пытанні Яго святасці.



Кірыл, мітрапаліт Смаленскі і Калінінградскі



Уладзімір, мітрапаліт Кіеўскі і всея Украіны



Уладзімір, мітрапаліт Санкт-Пецярбургскі і Ладажскі

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 26 студзеня, панядзелак

---

**05.30** Дакументальна-пазнавальны серыял «Таямнічы свет жывёл» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мы пазнаёміліся ў Інтэрнэце».
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**13.05** Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі» (СССР - Італія).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.05** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.40** «Арэна». Праграма аб спорце.
**20.00** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 00.30** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.50** «Прысвячэнне сябру». Канцэрт Іосіфа Кабзона.
**00.20** Дзень спорту.
**01.15** Усе стыхіі.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Прадаўцы смеху».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.50** Нашы навіны.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**23.55** «Прафесійны бокс».
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Наша справа».
**14.30** «Далёкія сваякі».
**14.45** «Фантастычныя гісторыі».
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Франц+Паліна». Беларусь-Расія, 2006 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**23.55** «Закон і крымінал».
**00.00** «Сталічны футбол».
**00.30** «Гучная справа».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Тэлебарометр.
**08.35** Усё аб бяспецы.
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**09.55** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.45** Гістарычны фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў» (СССР).
**12.25** Слова пісьменніка.
**12.55** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.40** Бухта капітанаў.
**14.20** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** «Таемны густ». Кулінарная праграма.
**15.45** «Шунін і бландынкі». Аўтамабільная праграма.
**16.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**20.50** Калыханка.
**21.10** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР).
**22.25** Хакей. НХЛ. Матч зорак.
**00.05** Хакей. Формула гульні.

---

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.15** Фільм «На чужым свяце». 1981 г.
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.30** Пакой смеху.
**12.20** Кінаэпапея «Блакада».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Парадоксы Аляксея Пятрэнкі». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Сумленны дэтэктыў».
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.30** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі», 2007 г.
**21.30** Тэлесерыял «Пастка», 2007 г.
**22.30** «Кулагін і партнёры».
**23.00** «Весткі+».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Рускі бас Максім Міхайлаў». Дакументальны фільм.
**00.15** Заканчэнне эфіру..

---

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** Сёння. Выніковая праграма.
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў».
**15.10** «Агляд. Выратавальнікі».
**15.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.27** Драматычны серыял «Квіток у гарэм».
**22.15** Прэм'ера. «Сумленны панядзелак».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.05** Містычны серыял «Медыум».
**00.50** «Школа зласлоўя».

---

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**10.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**15.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 8-ы.
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Канадзе (Ванкувер). HS 140.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Жанчыны. Мас-старт.
**20.15** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Мужчыны. Мас-старт.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Фінал. Токіо.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.45** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**01.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 8-ы.
**02.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 9-ы. Прамая трансляцыя.

## 27 студзеня, аўторак

---

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Горацкія пацехі» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны».
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.25** Драматычны серыял «Доктар Хаўс» (ЗША).
**22.50** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Ігнат Дамейка. Частка 1-я.
**23.20** Крымінальны трылер «Зман» (ЗША).
**01.10** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Чакай мяне».
**09.50** «Прабач, калі зможаш».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына». 14-я серыя.
**22.05** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.00** «Зваротны адлік».
**00.30** Нашы навіны.
**00.45** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінщчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Франц+Паліна». Беларусь-Расія, 2006г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.35** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Мінщчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** «Аўтапанарама».
**20.55** «Мядзведжае паляванне». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.25** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.20** «Закон і крымінал».
**00.25** «Рэактыўны бокс».
**00.55** «Надзвычайныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-2» (Расія).
**10.05** У гэты дзень.
**10.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.55** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.40** Хакей. Формула гульні.
**12.10** «Спорт, спорт, спорт...».
**12.35** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР).
**13.45** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.30** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Бітва экстрасэнсаў.
**16.20** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-3» (Расія).
**19.50** Беларуская часіна.
**20.45** Калыханка.
**21.05** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР).
**22.25** Спорт-кадр.
**22.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - ЦСК (Масква).

---

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.15** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.05** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Капкан», 2007 г.
**12.15** Кінаэпапея «Блакада».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Вялікія прарочыцы. Ванга і Матрона».
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Вандраванні натураліста».
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Кармеліта».
**20.15** Канцэрт, прысвечаны 65-годдзю са дня поўнага зняцця блакады Ленінграда. Трансляцыя з Санкт- Пецярбурга.
**22.40** «Таямніцы блакаднага горада». Дакументальны фільм.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** «Эпоха ў камені». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

---

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Двое з куфара».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**15.15** Вар'яцкі дзень. Агляд.
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**18.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.27** Драматычны серыял «Квіток у гарэм».
**22.15** Прэм'ера. «Вочная стаўка».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Блакада Ленінграда».
**00.55** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

---

**04.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 9-ы. Прамая трансляцыя.
**08.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 9-ы.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 9-ы. Прамая трансляцыя.
**15.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 9-ы.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Шладмінг). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.15** Вось дык так!!!
**20.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Шладмінг). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**22.45** Бокс. Міжнародны паядынак у Кітаі.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Монтэ-Карла). Агляд.
**00.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Дзень 9-ы.

## 30 студзеня, пятніца

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Лінія абароны» (Расія). Заключная серыя.
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**11.40** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3» (ЗША).
**14.05** Шпілька.
**14.30** Моладзевы камедыйны серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мая мама - мая сяброўка».
**17.50** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**23.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха». Ігнат Дамейка. Частка 4-я.
**00.05** Прэм'ера. Крымінальная трагікамедыя «Залегчы на дно ў Бруге» (Вялікабрытанія - ЗША).
**01.50** Дзень спорту.
**02.05** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм. 27-я серыя.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына». 16-я серыя. Заключная.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Шырокая рака». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Злачынствы стагоддзя».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** КІВІН-2009 у Сочы.
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** Прэм'ера. Фільм «Загана на экспарт».
**01.20** «Наша Belarussia».
**01.50** Нашы навіны.
**02.05** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Мядзведжае паляванне». Серыял.
**09.35** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Закон і крымінал».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Прыватныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Асабісты інтэрас.
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.35** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Гарачы лёд».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Камедыя «Уцёкі». Францыя, 1978 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** Фільм «Маша і мора». Украіна, 2007 г.

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-3» (Расія).
**09.10** Час футбола.
**09.40** У гэты дзень.
**09.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**10.40** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.30** Дакументальна-пазнавальны фільм «Чароўны погляд Мішэль Марган» (Францыя).
**12.25** Кінараман «Доўгая дарога ў выдмах» (СССР). Заключная серыя.
**13.40** Сямейная меладрама «Дарога да хаты» (Паўднёвая Карэя).
**15.15** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**16.00** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Школа рамонту.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.20** Бітва экстрасэнсаў.
**20.20** Калыханка.
**20.40** «Грандыёзная гонка». Забаўляльная праграма (ЗША).
**21.35** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй» (ЗША).
**23.50** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.15** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.05** Тэлефільм «Калі ў вас няма цёткі».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Карункі».
**12.15** Фільм «Журботная нячуласць».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Засакрэчаны Герай Савецкага Саюза». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**18.00** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**21.20** Камедыя «Граф Монтэнегра».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** Фільм «Дзікі табун». 2003 г.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Крамлёўскія пахаванні».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Хвацкія 90-я».
**10.50** «Авіятары».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Двое з куфара».
**12.10** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Мангуст».
**15.35** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Кодэкс гонару».
**18.20** Вар'яцкі дзень. Агляд.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.30** Фільм тыдня. Прэм'ера. Баявік «Рэмба-4».
**23.05** Прэм'ера. Камедыя «Клеркі-2».
**00.40** «Суперстар» прадстаўляе: юбілейны канцэрт Лаліты.
**02.25** «Наша тэма».

**09.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Мужчыны. Паўфінал.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Мужчыны. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**13.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба.
**14.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). Кваліфікацыя.
**16.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Мужчыны. Паўфінал.
**18.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**18.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Адмысловы выпуск.
**19.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). Кваліфікацыя.
**20.00** «Самыя моцныя людзі планеты». Гран-пры суперсерый у Швецыі.
**21.00** Боўлінг. Кубак свету ў Мексіцы. Мужчыны. Фінал.
**22.00** Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. Фінал.
**23.00** Шары. Чэмпіянат свету ў памяшканні (Норфалк, Вялікабрытанія).
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 1-ы.
**00.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**01.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**01.15** Футбол. Еўрагалы. Адмысловы выпуск.
**01.30** Вось дык так!!!
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 1-ы.

## 31 студзеня, субота

**06.25** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну».
**06.50** Брытва Окама.
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Здароўе.
**09.45** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.15** Шпілька.
**10.50** Ранішняя хваля.
**11.30** «Будні чэмпіёнаў».
**12.10** Лірычная камедыя «Якія не паддаюцца» (СССР).
**13.45** Дакументальны серыял «Таямніцы забытых перамог» (Расія).
**14.15** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.25** Відэафільм АТН «Модныя грошы».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.40** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.45** Відэафільм АТН «Прывіды Лідскага замка» цыклу «Зямля беларуская».
**18.25** «Ваша лато».
**19.15** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** Лірычная камедыя «Як знайсці ідэал» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Драматычны трылер «Адданы садоўнік» (Вялікабрытанія - Германія).
**00.00** «Уласнай персонай».
**00.25** Моладзевы гумарыстычны серыял «Клава, давай!» (ЗША).

**07.00** Суботняя раніца.
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.30** «Здароўе».
**10.10** «Смак».
**10.50** «Кветкі як цуд». Дакументальны фільм.
**11.20** Суботні «Ералаш».
**11.40** Фільм «Восеньскі марафон».
**13.20** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.50** Фільм «Якаў ігуач».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Іронія лёсу Сяргея Безрукава».
**17.15** Міхаіл Задорнаў. «Гэта вар'яцкі, вар'яцкі свет».
**18.05** Прэм'ера. «Аляксандр Парахаўшчыкоў. Утаймаванне свавольнага».
**19.05** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**20.00** Вялікая палітыка.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Музычны фільм «Навагодняя ноч».
**23.05** Прэм'ера. Прыгодніцкі фільм «У імя караля: Дэманы падзямелля».
**00.55** Фільм «Сэкс і маці-адзіночка».

**07.00** «Анфас».
**07.15** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.05** «Прыгоды рудага Майкла». Румынія-Германія, 1979г.
**09.30** «Мая хата».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Каралі і капуста». СССР, 1978г.
**15.35** «Відавочнік прадстаўляе: самае шакавальнае».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Наша справа».
**16.50** «Народжаныя ў СССР».
**17.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**18.30** «Я - вандроўца».
**19.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Паляўнічыя за розумам». ЗША, 2004г.
**22.00** «Смех у вялікім горадзе».
**22.45** Фільм «Мары аб Каліфорніі». Румынія, 2007г.
**01.20** Фільм «Прыгожае цела». ЗША, 1997г.

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.15** Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** «Таемны густ». Кулінарная праграма.
**10.30** «Шунін і бландынкі». Аўтамабільная праграма.
**11.00** Жаночая ліга.
**11.25** Школа рамонту.
**12.15** Невытлумачальна, але факт.
**13.10** «Лабірынты: святыя азёры».
**13.40** Мастацка-публіцыстычны фільм «Блаславіце наведаць мясціну...» (Беларускае тэлебачанне).
**14.05** Запал па культуры. Ток-шоў.
**14.45** Касмапалітэн. Відэаверсія.
**15.40** «Спорт, спорт, спорт...».
**16.10** Дэтэктыўны серыял «Няўдача Пуаро» (Расія). 1-5 серыі.
**21.00** Жаночая ліга.
**21.25** Прэм'ера! Рамантычная камедыя «Экс- палюбоўнік» (ЗША).
**23.05** Меладрама «Дарога» (Расія).
**00.25** «Казанова». Тэлечасопіс для мужчын.

**07.00** Весткі.
**07.10** Экранізацыя рамана «Расія маладая», 1982 г. 7-я серыя.
**08.20** Мультфільмы. «Як казакі ў футбол гулялі», «Бабуліна шафа».
**08.50** «Мой срэбны шар».
**09.45** «Суботнік».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** Пакой смеху.
**11.25** Фільм «Доўгі дзень». 1961 г.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 6, «Шэрыф у законе». 1 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Жыццё насуперак. Міхаіл Таніч». Дакументальны фільм.
**15.15** Меладрама «Вандраванне будзе прыемным». 1982 г.
**16.50** «Крывое люстэрка». Тэатр Яўгенія Петрасяна.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.25** Фільм «Каханы па найманні». 2007 г.
**23.25** Фільм «Анёлы смерці». 1993 г.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

**07.30** Мультфільм.
**08.00, 10.00** Сёння.
**08.15** «Казкі Бажэнава».
**08.40** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Асоба небяспечны!».
**14.00** Камедыйны дэтэктыў «Пстрыкні пальцам толькі раз...».
**16.00** «Сёння».
**16.25** «Жаночы погляд».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Злачынны намер».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**19.55** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**20.55** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**21.50** «Ты не паверыш!».
**22.45** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў. Паўфінал. Фінал.
**00.10** Камедыя «Прыдуркі».

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 1-ы.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**10.15** Футбол. Еўрагалы. Адмысловы выпуск.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. Жанчыны. Спрынт вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**15.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Францыі (Шо-Нев). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**16.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск.
**17.45** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Канадзе. Мужчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**18.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). HS 134.
**20.15** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Жанчыны. Фінал.
**22.00** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Канадзе. Мужчыны. Спрынт.
**22.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Канадзе. Жанчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. К-1. Сусветны Гран-пры (Токіо). Фінал.
**01.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 2-і.
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). HS 134.
**02.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 2-і.

## 1 ЛЮТАГА, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**06.25** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.50** Прыгодніцкі фільм «Спартак і Калашнікаў» (Расія).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 12.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.05** Культурныя людзі.
**10.40** Усе стыхіі.
**11.15** У свеце матораў.
**11.45** «Еўрафэст. Дзень за днём».
**12.15** Сямейная трагікамедыя «Радня» (СССР).
**14.00** Хакей для ўсіх.
**14.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**15.55** Гісторыка-біяграфічная драма «Пушкін. Апошні двубой» (Расія).
**17.55** Суперлато.
**18.55** Дэтэктыўная меладрама «Сіняя барада» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.35** Прэм'ера. Гістарычная драма «Бобі» (ЗША).

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.45** «Шалапутныя нататкі».
**10.05** Пакуль усе дома.
**10.55** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**11.35** «Дарослыя казкі аб жывёлах». Дакументальны фільм.
**12.05** «Зваротны адлік».
**12.35** Камедыя «Па сямейных абставінах».
**15.00** «Неверагодныя гісторыі пра жыццё». «Партовы раман».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Новыя песні аб галоўным». Канцэрт у Крамлі.
**18.20** Прэм'ера. Фільм-сенсацыя. «Цвіль».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.20** Фільм «Мой лепшы палюбоўнік».
**00.15** «Камедзі Клаб» да 00.55.

### СТВ

**07.00** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.50** Камедыя «Уцёкі». Францыя, 1978 г.



**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.45** «Далёкія сваякі».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Добры дзень, доктар!».
**13.00** Фільм «Дуэнья». СССР, 1978г.
**14.40** «Дарагая перадача».
**15.05** «Культурнае жыццё».
**15.35** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэтраманія».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Прэм'ера! Фільм «Оксфардскія забойствы». Францыя-Вялікабрытанія, 2008 г.



**22.25** «Спартовы тыдзень».
**22.55** «Вялікая гісторыя»: «Раўналежныя міры».
**00.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.40** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Мультфільм.
**10.15** Фільм «Прыгоды Тома Сойера і Гекльберы Фіна» (СССР). 1-я серыя.
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.05** Пасоўванне+.
**12.25** Гаспадар.
**12.55** Спявай, душа.ву.
**13.20** Мастацкі фільм «Дзеці прыроды» (Францыя).
**15.20** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Спартак (Масква). Прамая трансляцыя.
**19.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ліверпуль - Чэлсі.
**21.10** Тэлебарометр.
**21.30** «Правы чалавека».
**21.45** Адмысловы праект тэлеканала «ЛАД» «Вялікае сэрца». Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў.
**23.25** Свая музыка.
**23.55** Пасоўванне +.

### РОССИЯ

**07.00** «Таямніца зніклага абраза».
**07.45** Інтранізацыя Найсвяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсёй Русі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Як стаць шчаслівым». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 6, «Шэрыф у законе». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Гарадок». Дайджэст.
**14.55** Фільм «Дым Айчыны». 1980 г.
**16.35** «Аншлаг і Кампанія».
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**20.30** Фільм «Канец свету». 2006 г.
**00.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх нормавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.55** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.25** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.10** Трагікамедыя «Шык».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Дужанне за ўласнасць».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак: Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**20.50** «Галоўны герой».
**21.50** Трылер «Цёмны лес».
**23.30** Авантурная камедыя «Сняданак на Плутоне».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). HS 134.
**10.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Мужчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. Гонка праследу.
**14.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. Гонка праследу. Прамая трансляцыя.
**15.00** Лыжнае двайборства. Кубак свету ў Францыі (Шо-Нев). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**16.00** Велакрос. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Мужчыны. Фінал.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). HS 134.
**20.00** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Канадзе. Мужчыны. Гонка праследу. Прамая трансляцыя.
**20.45** Зімовыя выгляды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**21.15** Бокс. Сярэдняя вагавая катэгорыя. Адмысловы выпуск.
**23.00** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў. Мужчыны. Гонка праследу.
**23.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Канадзе. Жанчыны. Гонка праследу. Прамая трансляцыя.
**00.15** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 3-і.
**00.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Японіі (Сапара). HS 134.
**01.30** Зімовыя выгляды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Ірландыі». Дзень 3-і.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ______ (по реестру ф. 11)
№ ______ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ______ руб.
(сумма прописью)

Кому / Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ______

Адрес ______
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ЦІКАВА

# FIRST PET — ПЕРШЫ САБАКА ШТАТАЎ

Іван БІЧ

**Для шматлікіх амерыканцаў, асабліва маленькіх, пытанне, якога сабаку абярэ прэзідэнт Барак Абама, каб забраць яго ў Белы Дом, застаецца больш важным, чым вайна ў Газе або эканамічны крызіс.**

Гэта гісторыя пачалася 4 лістапада 2008 года, калі Барак Абама выступаў на мітынгу ў Чыкага. На той час ужо была відавочная ягоная перамога над рэспубліканскім кандыдатам Джонам Маккейнам. Абама выступіў з дастаткова доўгай святочнай прамовай, аднак 60-тысячнай аўдыторыі больш за ўсё запомніліся словы, якія будучы прэзідэнт адрасаваў сваім абедзвюм дочкам. «Малія і Саша, я вас люблю так, што вы не здольны нават уявіць і, мяркую, вы заслужылі права на тое, каб атрымаць маленькага сабаку, якога возьмеце з сабой ў Белы дом». Гэтыя словы, з аднаго боку, былі экспромтам, з другога — данінай традыцыі. Амаль кожны гаспадар будынка на Пенсільванія Авеню 16 (тут у Вашынгтоне знаходзіцца Белы дом) меў сабаку. У Амерыцы нават існуе цэлы інстытут first pet — хатняя жывёла № 1.


Хім Лінды Джонсан


Бадзі сямейства Клінтанаў


Ліберці, сабака Джеральда Форда


Фала, сабака Франкліна Рузвельта.

Гісторыя, праўда, не захавала мянушак любімых сабакаў першых кіраўнікоў ЗША — Джорджа Вашынгтона і Джона Адамса. Аднак тое, што яны мелі сабак, даказана. Інакш іспанскі кароль не паслаў бы ў якасці падарунка Джорджу Вашынгтону менавіта шчаня. Аднак пачынаючы з трэцяга прэзідэнта гісторыкі пачалі больш уважліва ставіцца да факту наяўнасці сабак у Белым доме і іх мянушак. Зараз гісторыкі са спасылкай на архіўныя дакументы могуць абсалютна аўтарытэтна заяўляць: акрамя арыстакратычнага Чэстэра Артура, які кіраваў Штатамі з 1881 па 1885 год, кожны прэзідэнт краіны меў любімага сабаку, якога трымаў у Белым доме.

Тыя сабакі часам станавіліся героямі медыя. Найбольш папулярнымі сярод *first pet* былі Паўліна — сабака прэзідэнта Уільяма Тафта (1909–1913), Фала — Франкліна Рузвельта, Хім — Лінды Джонсан. Апошні быў настолькі славуты, што выяву яго пыскі апублікавалі на вокладцы вядомага часопіса Life. Джэральд Форд, калі яго ратвейлер патрабаваў прагулкі, прыпыняў усе дзяржаўныя справы. Барні, сабака прэзідэнта Джорджа Буша-малодшага, быў героем спецыяльнай перадачы. У адной з іх зняўся былы кіраўнік кабінету Вялікабрытаніі Тоні Блэр. Пасля гэтай праграмы да яго, дарэчы, і прыляпілася агідная мянушка — «любімы пудзель Буша».

Некаторыя сабакі адыгралі вялікую ролю ў палітыцы. Напрыклад, Пушынка — дачка сабакі па мянушцы Стрэлка, якую кіраўнік савецкіх касмічных праграм Сяргей Каралёў разам з Белкай запусціў у космас напярэдадні палёту Гагарына. Пушынка была падараваная Мікітай Хрушчовым прэзідэнту Джону Кенэдзі пасля заканчэння Карыбскага крызісу як сімвал міру паміж народамі ЗША і СССР.

У Вашынгтоне нават існуе музей прэзідэнцкіх сабак. Там утрымліваецца інфармацыя пра 400 сабак, якія на працягу двух стагоддзяў жылі ў Белым доме.

У гэтым кантэксце няма нічога дзіўнага ў тым, што пытанне, якога сабаку абярэ Барак Абама, стала сапраўднай забаўкай для нацыі. Узнік нават асаблівы тэрмін «Сабака Абамы» (Obama's dog). Праблеме выбару аптымальнага сабакі былі прысвечаныя артыкулы самых аўтарытэтных часопісаў. Лепшыя кінолагі давалі свае рэкамендацыі. Па падліках спецыялістаў, 56 мільёнаў чалавек пакінулі на інтэрнэт-форумах свае думкі на гэты конт.

У тым жа інтэрнэце ішлі шматлікія галасаванні наконт кандыдатаў сярод розных парод. Уся Амерыка гадала і гадае: прадстаўнік якой пароды — пудзель, лабрадор або такса — пераможа ў гэтым экзатычным конкурсе на тытул first pet? Адны патрабавалі, каб Абама знайшоў шчаня з добрай радаслоўнай. Іншыя лічылі, што апошні выбар маюць мець самі Саша і Малія. Аднак без дапамогі спецыялістаў тут не абышлося. Справа ў тым, што Малія мае алергію на сабачую поўсць. Таму кола кандыдатаў было скарочана.

American Kennel Club — самая вядомая кіналагічная арганізацыя краіны — арганізавала сваё галасаванне па кандыдатуры сабакі для Абамы. У фінал прайшлі пяць парод — пудзель, ірландскі тэр'ер, шнаўцэр, кітайская хахлатая і балонка. У выніку галасавання, у якім бралі ўдзел 42 тысячы чалавек, перамогу атрымаў пудзель.

У сваю чаргу, сам прэзідэнт заявіў, што хацеў бы ўзяць сабаку з пітомніка для бездаглядных жывёл. Сабак без добрай радаслоўнай было, дарэчы, няшмат у Белым доме. Магчыма, самы вядомы сярод іх Хім, якога Лінда Джонсан падабраў на запраўцы ў Тэхасе. Ідэя ўзяць у Белы дом шчаня з пітомніка карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод абаронцаў жывёл. The Best Friends Animal Society — асацыяцыя сяброў жывёл — атрымала 50 000 лістоў у падтрымку такога кроку прэзідэнта. Сябры арганізацыі маюць надзею, што прыклад Абамы стане штуршком для таго, каб людзі звярнулі ўвагу на лёс пакінутых меншых сяброў чалавека. Праўда, медыкі лічаць, што Барак і Мішэль Абамы не павіны рызыкаваць. Сабака невядомага паходжання можа быць таксама небяспечным для здароўя Маліі.

Лёс новага first pet часткова быў вырашаны 11 студзеня. Сям'я Абамы, як заявіў Барак, знайшла ў сабачым пітомніку двух верагодных кандыдатаў. Адзін з іх — лабрадор. Другі — сабака партугальскай пароды. Такім чынам, засталося няшмат чакаць, каб даведацца, хто з іх стане пераможцам і пераедзе ў Белы дом. Інтрыга, пагадзіцеся, не саступае інтрызе выбараў прэзідэнта ЗША.

Напрыканцы застаецца дадаць, што сабака можа стварыць шмат праблемаў для гаспадароў Белага дому. Так Бадзі, сабака Клінтанаў, не паладзіў з іх катом Соксам. У выніку шматлікіх боек кот быў вымушаны жыць у іншым крыле прэзідэнцкай адміністрацыі.


Барні, сабака прэзідэнта Джорджа Буша-малодшага.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Разумееце, калі нам спрабуюць расказаць, што ў гэтай вайны выключна эканамічныя асновы, у сэнсе для «Газпраму», у гэта верыцца з вялікай цяжкасцю. Па-першае, мы толькі што падпісалі дамову з Беларуссю, дзе па 160 долараў прадаём Беларусі газ у абмен, здаецца, на прызнанне Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Прычым, адзначу, Беларусь дамову падпісала, газ атрымала, а Бацька Лукашэнка па сваёй звычцы Абхазію і Паўднёвую Асецію пакуль не прызнаў. Нас, здаецца, у чарговы раз кінулі. Увогуле, ведаеце, у нас у сувязі з газавымі справамі такая дэфініцыя сяброў Расіі: сябры — тыя, хто могуць красці ў «Газпрама», ворагі — тыя, з каго «Газпрам» бярэ па тарыфу.

**«Эхо Москвы» (Расія)**

Заходняя частка СНД — Беларусь і Малдова — таксама аказалася ўцягнутай у газавы канфлікт. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паспрабаваў лавіць рыбку ў мутнай вадзе, прапанаваўшы Маскве пабудаваць новы газаправод. Натуральна, праз тэрыторыю сваёй краіны. Праўда, у моцным хоры «газавых галасоў» прапанова Лукашэнкі, здаецца, патанула.

**«Независимая газета» (Расія)**

У Мінску, Рызе і Маскве ў палітычных колах абмяркоўваюць чуткі пра тое, што старэйшы сын Аляксандра Лукашэнкі Віктар шукае кантакты з Барысам Беразоўскім, якога ў Расіі лічаць амаль ворагам нумар адзін. Сам Беразоўскі дае падставы такім плёткам. І калі ўплыў апальнага алігарха на Мінск будзе сапраўды маштабным, Беларусь можа змяніць свой курс. У выніку са сваім імперскім падыходам Расія можа апынуцца ў ізаляцыі.

**«Литовский курьер» (Літва)**

Аднак галоўныя прынцыпы выхаду з крызісу вядомыя. Яны лагічныя і зразумелыя. Адзін з іх — лібералізацыя малога і сярэдняга бізнесу і максімальная падтрымка яго развіцця. Гэта настолькі важна, што нават у Беларусі прэзідэнт Лукашэнка абвясціў лібералізацыю, якая не мела прэцэдэнтаў, для бізнесу і забараніў на палову года любыя праверкі.

**УНІАН (Украіна)**

Апошнія 15 гадоў быццам і не было ў цяперашняй Беларусі: у крамах чэргі, тавары скупляюцца не па неабходнасці, а на ўсякі выпадак — таму, што яны проста ёсць. Людзі намагаюцца пазбавіцца беларускай валюты, і як мага хутчэй. Дэвальвацыя рубля, якая была праведзеная ў навагоднюю ноч, абваліла апошнія астаткі даверу да ўлады, нават у тых, хто шчыра галасаваў за яе.

**«Новая газета» (Расія)**

Лукашэнку доўгі час удала эксплуатаваў пазітыўны ў народзе імідж «сапраўднага мужыка». Аднак спроба надаць яму дадатковыя рысы «бацька беларускай эканамічнай лібералізацыі» ў выніку не была зразумелая беларусамі.

**«Евразийский дом» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АРГЕНЦІНА: АЎТАПРАБЕГАМ ПА ЭКОЛАГАХ І ІНДЗЕЙЦАХ



Эколагі і індзейцы Патагоніі спрабуюць, нават рызыкуючы сваім жыццём (пікеты на дарогах), прыпыніць рух сусветнага вядомага аўтамабільнага ралі Парыж — Дакар, якое ў гэтым годзе праводзіцца ў Паўднёвай Амерыцы па маршруту з Чылі ў Буэнас-Айрэс. На думку навукоўцаў, якія пратэстуюць, такая колькасць машын (у ралі акрамя гоначных аўто і матацыклаў бяруць удзел грузавікі) можа парушыць унікальную экасістэму Патагоніі. Што да індзейцаў, то, па іх словах, аўтамабільная маса выклікае ў іх памяці негатыўныя фрагменты захопу Патагоніі аргенцінскімі войскамі, якія акупавалі гэты рэгіён напрыканцы XIX стагоддзя. Цікава, што да акцый далучыліся і аргенцінскія нацыяналісты, якія ў настойлівых спробах ураду атрымаць права на правядзенне ралі ўбачылі праявы «прастытуцыі» і «еўрафіліі».

### ФРАНЦЫЯ: ХТО ВІНАВАТЫ Ў КЛАСАВАЙ ВАЙНЕ?

Францыя гучна святкуе 200-ю гадавіну нараджэння свайго славутага земляка П'ера Прудона, якога ў СССР за яго вядомую фразу: «Маёмасць — гэта крадзеж» запісалі ў фанатычныя анархісты. П'ер Прудон сапраўды называў сябе анархістам, што не замінала яму быць дэпутатам парламента, а ў часы дыктатуры Банапарта Трэцяга апынуцца ў турме за прапаганду ідэі рэспублікі. А яшчэ Прудон праславіўся як аўтар канцэпцыі і заснавальнік «Народнага банку», які лічыцца першым кааператыўным банкам у гісторыі. Нарэшце, палемізуючы з Прудонам, які выступаў за саюз сярэдняга класу і пралетарыяту, Карл Маркс упершыню ўжыў выраз «класавая вайна». Да юбілею Прудона вядучыя выдавецтвы краіны перавыдалі шэраг яго прац, а самыя апантаныя яго прыхільнікі заклікаюць урад выкарыстоўваць ідэі «Народнага банку» Прудона для барацьбы з банкаўскім крызісам.

### ГЕРМАНІЯ: КАМУ ВЫГАДНЫ КРЫЗІС?



Вынікі выбараў у парламент зямлі Гесен, якія мелі месца 18 студзеня, паставілі ў тупік шматлікіх гісторыкаў і палітолагаў. Яны парушылі аксіёму, згодна якой у час крызісаў — а менавіта ў такім стане знаходзіцца гаспадарка Германіі — выбаршчыкі галасуюць за левых. Але не зараз. Галоўным пераможцам галасавання ў Гесене аказаліся якраз правыя. Хрысціянскія дэмакратычны саюз Ангелы Меркель набраў 37 працэнтаў. Іх галоўныя левыя канкурэнты, сацыял-дэмакраты, атрымалі толькі 23 працэнты (на 13 пунктаў ніжэй, чым на папярэдніх выбарах). Яшчэ адна правая партыя — Вольныя дэмакраты — палепшыла свае пазіцыі аж на сем працэнтаў. У лібералаў — 16 працэнтаў. Крах эсдэкаў яшчэ можна патлумачыць унутраным крызісам, у якім партыя знаходзіцца з часоў Шродэра — аўтара непапулярных ліберальных рэформаў. Аднак і другая левая партыя — таксама выступіла вельмі сціпла, нягледзячы на вельмі радыкальную праграму — нацыяналізацыі банкаў і г. д. Левыя ледзь набралі пяць працэнтаў, патрэбных для ўваходу ў парламент. На думку і кансерватараў і лібералаў, выбары ў зямлі Гесен сталі рэпетыцыяй прызначаных на восень выбараў у Бундэстаг.




### ВЕНЕСУЭЛА: СТАЛІЦА ТАКСАМА БУДУЕ САЦЫЯЛІЗМ

Гэтымі днямі сталіца Каракаса ператварылася ў поле надзвычайнай актыўнасці радыкальных прыхільнікаў Чавеса. Малавядомая група «Народны рэвалюцыйны супраціў» (Resistencia Popular Revolucionaria) атакуе дамы і кватэры вядомых апазіцыянераў фарбавымі бомбамі, размалёўвае іх будынкі графіці і г.д. Дасталося таксама офісу апазіцыйнага тэлебачання і пасольству Ватыкана. Хуліганы (прыблізна каля трох тысяч) пры гэтым нават не хаваюцца: яны разбілі лагер на цэнтральнай плошчы Балівара, адкуль робяць свае вылазкі. Мэта — муніцыпалітэт сталіцы, жыхары якой нядаўна абралі мэрам сябра апазіцыйнай партыі, што, на думку радыкалаў з Народнага рэвалюцыйнага супраціву, тармозіць праграму будаўніцтва сацыялізму, за які змагаецца ўся краіна. Па меркаванні экспертаў, лозунг пра адрыў сталіцы ад тэмпаў будаўніцтва сацыялізму — хлусня. Справа ў іншым: зараз Чавес рыхтуе новы рэферэндум, які б мог даць яму магчымасць абірацца на пасаду прэзідэнта неабмежаваную колькасць разоў (пакуль, паводле заканадаўства, адзін і той жа грамадзянін Венесуэлы можа займаць вышэйшую пасаду не больш за два тэрміны), і шляхам фарбавага тэрору ён імкнецца запалохаць апазіцыю.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# НОВЫ СТАРШЫНЯ — МАРЫНА!

Алег НОВІКАЎ

**Галоўным праварадыкалам Францыі будзе… кабета. Марына Ле Пэн рыхтуецца пераняць ад бацькі кіраўніцтва Нацыянальным Фронтам.**



Яе бацька Жан-Мары Ле Пэн кіраваў НФ з далёкага 1976 года. Трэба прызнаць, што дзякуючы яму Фронт, які пачынаў як маленькі гурток незадаволеных алжырскай палітыкай Парыжа прыхільнікаў прафашысцкага рэжыму Вішы, здолеў стаць заўважным акцёрам на французскай палітычнай сцэне. Апошнім часам, аднак, антыэміграцкія лозунгі, якія доўгі час былі фішкай франтавікоў, перахапіў Нікаля Сарказі. Гэта крыху адбілася на маштабах уплыву партыі.

Так ці інакш, для Жан-Мары Ле Пена, якому стукнула за 70 гадоў, прыйшоў час ісці на пенсію. У верасні ён афіцыйна заявіў, што на партыйным кангрэсе ў жніўні 2009 года перадасць уладу нашчадку.

Пытанне пра тое, хто здольны заняць месца Ле Пэна, абмяркоўваецца ў шэрагах Фронту даўно. Некаторыя, так і не дачакаўшыся адстаўкі кіраўніка, нават сыходзілі з партыі і стваралі свае палітычныя фармацыі. Так ці інакш, у выніку перамагла дачка правадыра — Марына.

Марына Ле Пэн нарадзілася ў жніўні 1968 года, закончыла парыжскі універсітэт па спецыяльнасці «адвакатура». З 1998 года працуе ў апараце партыі. Калі ёй было 24 гады, бацька настаяў, каб яна балатавалася па адназму з парыжскіх выбарчых участкаў. Марына атрымала 11 працэнтаў. У 2003 годзе мадам Ле Пэн увайшла ў кіраўніцтва Фронту і зрабіла хуткую партыйную кар'еру. Зараз яна віцэ-прэзідэнт партыі, дэпутат еўрапарламенту. Яна спачатку была замужам за прадпрымальнікам, які спансіраваў Фронт. Потым выйшла за сакратара партыі. Марына мае трох дзяцей.

Яе перамозе ў барацьбе за пасаду будучага партыйнага старшыні садзейнічалі шматлікія фактары: патранат бацькі, добрая арганізацыйная кампанія (пры партыі была створана асацыяцыя яе прыхільнікаў «Аб'яднанне блакітнай энергіі Марыны»), сяброўства з рок-музыкамі, якія папулярныя ў асяроддзі скінхедаў, адкуль Фронт чэрпае кадры. Дапамаглі і структурныя змены. Галоўны друкаваны орган Фронту «National Hebdo», рупар ветэранаў, аказаўся банкрутам. Рэдактар новага праекту — таксама сябар Марыны.

Прыход Марыны бурна абмяркоўваюць на старонках газет і палітычных часопісаў. Ён разглядаецца як вялікі пераварот у шэрагах ультраправых. Марына даўно і паслядоўна стварала сабе імідж хутчэй кансерватыўнага палітыка, чым хворага нацыста. Ахвотна давала інтэрв'ю жоўтым і жаночым выданням, тусавалася на розных прыёмах і фуршэтах. Неяк нават заявіла, што падтрымлівае правы жанчын на аборты.

Падобная ідэя кансерватыўна-ліберальнай мадэрнізацыя выклікала шок у каталікоў-фундаменталістаў, якія наадварот прапанавалі заканадаўства ў гэтай сферы зрабіць больш жорсткім.

Не менш звар'яцелі і праціўнікі сексуальных меншасцяў, якіх традыцыйна вельмі шмат у асяроддзі правых ультра. Аднойчы Марына Ле Пэн засвяцілася на старонках часопісу для гомасексуалістаў і лесбіянак. Больш за тое, яна назвала фашыстаў — праціўнікаў геяў — «людзьмі з маленькімі мазгамі».

Наўрад ці падабаюцца неанацыстам і пазіцыі Марыны па знешняй палітыцы. Марына на выступае як праамерыканскі палітык і заклікае калег па партыі вярнуцца да пячорнага антыкамунізму, які дамінаваў у партыі ў 80-я гады.

У кастрычніку 2003 года Марына наведала жаночы клуб Рэспубліканскай партыі ЗША і нават набівалася ў дэлегацыю ад Еўрапарламента ў Ізраіль. Праўда, у Тэль-Авіве такую ініцыятыву палічылі занадта экзатычнай. Раней Жан-Мары Ле Пэн неадназова меў праблемы з законам за адмаўленне факту Халакосту.

Пытанне, аднак, у тым, як паслядоўна яна зможа праводзіць падобную лінію на пасадзе лідэра Фронту. Як паказваюць апытанні, сярэдні выбаршчык НФ не падтрымлівае ліберальна-кансерватыўныя каштоўнасці Марыны. Падобныя забабоны блізкія сябрам галіцкай партыі Нікаля Сарказі.

Затое, у адрозненні ад Сарказі, Марына вельмі скептычна ставіцца да спроб малых этнасаў, кшталту брэтонцаў, дамагчыся правы вывучаць родную мову. Марына лічыць, што дамінацыя французскай мовы — ёсць аснова захавання французскай нацыі. Сарказі, як вядома, пайшоў насустрач брэтонцам, якія патрабуюць большай культурнай аўтаноміі.

У падобнай сітуацыі ў Марыны, калі яна стане правадыром, няма іншага выхаду, як пераглядзець свае былыя погляды і думаць перш за ўсё пра адзінства партыі.

Праўда, у Марыны ёсць у наяўнасці моцныя козыры, каб прымусіць старых нацыстаў і расістаў трансфармавацца ў ліберальных кансерватараў. Мова пра аўтарытэт бацькі, які можа ў выпадку чаго абламаць рогі ўсім незадаволеным. Стары Жан-Мары, здаецца, падтрымлівае новы фармат Фронту, які адстойвае Марына.

Дарэчы, на старонках правай і ліберальнай прэсы, якая выражае інтарэсы прадпрымальнікаў, абмяркоўваюць сцэнар, калі крызіс набудзе вялікі маштаб і справакуе сацыяльныя пратэсты. На думку экспертаў, Фронт з яго вечнай тэмай — ва ўсіх праблемах Францыі вінаватыя эмігранты, у такой сітуацыі будзе вельмі патрэбны.

МЕРКАВАННЕ

# КІЕЎ І МІНСК РАЗМАЎЛЯЮЦЬ

**Віталь Кулік, дырэктар украінскага Цэнтра грамадзянскіх даследаванняў праблем грамадзянскага грамадства ў інтэрв'ю журналісту «НЧ» Алегу Новікаву выказаў свае меркаванні наконт перамоваў Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Юшчанкі ў Чарнігаве 20 студзеня.**



***— Якое месца займае чарнігаўская сустрэча ў цяперашнім палітычным працэсе ва Украіне (дамова па газу, канфлікт паміж выканаўчай і заканадаўчай галінамі ўлады, ініцыятыва імпічменту Юшчанкі з боку Партыі рэгіёнаў, будучыя выбары прэзідэнта)?***

— Па сутнасці, калі параўноўваць актуальнасць чарнігаўскай сустрэчы з газавымі перамовамі, яна, натуральна, была на другім плане. Аднак трэба памятаць, што апошняя сустрэча прэзідэнтаў Юшчанкі і Лукашэнкі мела месца ў далёкім 2006 годзе. Сустрэча ў Чарнігаве — гэта канец блакіроўкі дыялога паміж Мінскам і Кіевам на вышэйшым узроўні.

***— Ініцыятарам сустрэчы быў беларускі бок. Ці мог быць матывам сябраваць з Кіевам апошні газавы расійска-украінскі канфлікт? Тым больш пасля заключэння дамовы з Украінай па газу Масква пачынае дамаўляцца з Мінскам па коштах на транзіт.***

— На маю думку, час сустрэцца быў абраны вельмі зручна. З аднаго боку, Маскве зараз відавочна не да Мінску. З другога — сама сустрэча Лукашэнкі і Юшчанкі носіць працоўны характар (гэта не афіцыйны візіт). Аднак палітычная вага прынятых у Чарнігаве рашэннях фактычна павысіла значэнне гэтай сустрэчы.

***— Шматлікія апазіцыйныя беларускія палітыкі расцанілі згоду Юшчанкі сустрэцца з Лукашэнкам як акт здрады Майдану. Ці маюць ва Украіне кантакты з Лукашэнкам нейкі ідэйны падтэкст?***

— Ва Украіне выключна пачорныя дэмакраты і антыкамуністы лічаць, што Юшчанка катэгарычна не павінен мець палітычных кантактаў з Лукашэнкам. Айчынная экспертная супольнасць, як і палітычная эліта, навучаныя горкім вопытам экспарту рэвалюцый у краіны Цэнтральнай Азіі (следствам такой палітыкі стаў разрыў газавых дамоў з Туркменістанам) і аказаннем «інтэрнацыянальнай дапамогі» Грузіі. Аксіялагічны падыход, калі на першым месцы каштоўнасці і прынцыпы, у пытаннях міжнародных адносінаў губляе сваю былую вагу. Зараз у павестцы дня прагматызм і рэалізм. Таму сярод кіруючай украінскай эліты няма алергіі на тое, што Юшчанка паціснуў руку Лукашэнку.

***— А якія адносіны да Лукашэнкі ў Цімашэнкі? Канчаткова аформіць дасягнутыя ў Чарнігаве дамовы павінны праз дзесяць дзён якраз яна і Сідорскі.***

— У Юліі Цімашэнка няма выразнай пазіцыі па Беларусі. Беларускае пытанне не актуальнае для яе блока. Таму Віктар Юшчанка мае эксклюзіўныя правы вызначаць павестку перамоваў. Цімашэнка падтрымае па факту ініцыятывы Юшчанкі, калі супярэчнасці паміж імі не набудуць фармат адкрытага канфлікту.

***— У Чарнігаве Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку Юшчанку за дапамогу ў нармалізацыі адносін з Захадам. Украіна сапраўды выступае лабістам Мінска?***

— Мяркую, што тут Лукашэнка проста быў неадэкватным (смяецца). Ва Украіне лічаць, што Кіеў у свой час згубіў шанец і магчымасць, каб выступіць адвакатам Беларусі перад ЕС. Таму цяпер Мінск мае магчымасці кантактаваць з чыноўнікамі ў Брусэлю без дапамогі дыпламатаў з Кіева. Калі аналізаваць дынаміку кантактаў Мінска з Берлінам або Лонданам, можна заўважыць, што ўзровень даверу паміж беларускім кіраўніцтвам і Еўрапейскай камісіяй куды большы, чым паміж Кіевам і Еўропай пасля апошняй газавай вайны. Аўтарытарная Беларусь аказалася больш прагназаваным партнёрам, чым «аранжавая» Украіна. З іншага боку, падобнымі заявамі Лукашэнка спрабуе стымуляваць Кіеў быць больш актыўным у лабіраванні беларускіх інтарэсаў у ЕС.

***— Таксама падчас сустрэчы была закранутая тэма праграмы «Усходняга партнёрства». Як украінскі ўрад ставіцца да гэтай ініцыятывы? Хутка адбудзецца саміт ЕС у Празе, на які запрошаны таксама Лукашэнка? Ці змогуць Кіеў і Мінск выступаць там агульна?***

— У Чарнігаве прэзідэнты Украіны і Беларусі дамовіліся актывізаваць супрацоўніцтва ў рамках ініцыятывы «Усходняе партнёрства». У прыватнасці Юшчанка адзначыў, што абмяркоўваў з беларускім калегам пытанне падрыхтоўкі агульных дзеянняў адносна рэалізацыі згаданай ініцыятывы. Пакуль рана казаць, што Мінск і Кіеў будуць мець кансалідаваную пазіцыю ў Празе. Аднак відавочна, што Лукашэнка і Юшчанка не задаволеныя эгаістычнымі паводзінамі Еўропы ў газавым канфлікце і хацелі б атрымаць ад Брусэля нейкую сатысфакцыю за газавае прыніжэнне.

***— Лукашэнка некалькі разоў гучна падтрымаў ідэю прэзідэнта Украіны стварыць энергетычны пояс Балтыйскае — Чорнае мора. Таксама ніводны з прэзідэнтаў не прыняў запрашэння Мядзведзева ўдзельнічаць у газавым саміце ў Маскве. Ці значыць гэта, што праект усходнееўрапейскага энергетычнага альянсу рэальны?***

— Я б ахарактарызаваў сваё стаўленне да падобных заяў як асцярожны аптымізм. Пакуль мова можа ісці пра пашырэнне цяперашняга патэнцыялу, асабліва ў пытаннях экспарту ўкраінскай электраэнергіі. Ёсць некаторыя перспектывы, што Беларусь пачне гуляць у еўрапейскія энергетычныя гульні. Аднак пояс «ад мора да мора» — гэта далёкая перспектыва.

***— Ці выйшаў украінска-беларускі дыялог са стану ступару пасля сустрэчы ў Чарнігаве?***

— Безумоўна. Аднак гэта пакуль толькі форма. Зараз патрэбна, каб чыноўнікі і МЗС напоўнілі яго нарматыўным і прававым зместам.

> Аксіялагічны падыход, калі на першым месцы каштоўнасці і прынцыпы, у пытаннях міжнародных адносінаў губляе сваю былую вагу. Зараз у павестцы дня прагматызм і рэалізм. Таму сярод кіруючай украінскай эліты няма алергіі на тое, што Юшчанка паціснуў руку Лукашэнку

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ДЭВІД КЭМЕРАН



Справы ў партыі торы, лідэрам якой з'яўляецца Дэвід Кэмеран, і так з-за эканамічнага крызісу ідуць не вельмі добра. А тут яшчэ выхадка Мэцью Левіса, аднаго з лідэраў моладзевай фракцыі партыі. 23-гадовы хлопец заявіўся на бал-маскарад у касцюме Мэдлін МакКан. Акрамя гэтага ён падзяліўся ідэяй фасону свайго касцюма на сваім блогу. Выхадка Мэцью выклікала буйны скандал. Мэдлін МакКан — чатырохгадовая дзяўчынка, якая знікла ў Партугаліі, дзе яе бацькі — грамадзяне Аб'яднага Каралеўства — праводзілі адпачынак. Пошукі зніклай дзяўчынкі сталі справай усёй нацыі, а ўсе выданні абышоў апошні здымак Мэдлін: дзяўчынка ў белай спадніцы і ружовым капелюшы (якраз такі і быў апрануты Мэцью). Не дзіўна, што гэта справакавала жорсткую крытыку на адрас Мэцью і партыі кансерватараў. Скандал прымусіў Дэвіда Кэмерана рашуча расправіцца з жартаўніком. Левіса выключылі з партыі, хаця сам ён да канца не разумее, у чым яго віна. Між тым, на думку назіральнікаў, выхадка Левіса цудоўна ілюструе маральны стан маладых торы, якія разглядаюць партыю як клуб маладых арыстакратаў, якім дазволена ўсё. Так, год таму кіраўнік маладых шатландскіх кансерватараў заявіўся на падобны бал-маскарад апрануты пад плантатара-рабаўладальніка. Ён вёў на ланцужку свайго намесніка па арганізацыі, які выконваў ролю раба. Чамусьці чарнаскурай камуне Шатландыі гэты жарт падаўся не смешным.

### ЛЕХ ВАЛЕНСА



Прэса нечакана паспрабавала аспрэчыць статус Валенсы — легендарнага лідэра прафсаюзнага руху «Салідарнасць», які пахаваў камунізм у Польшчы, — заявіўшы, што галоўным чыннікам рэвалюцыі быў не мужнасць Леха і яго таварышаў, а капрызы клімату. У снежні 1978 года ў Польшчы былі жудасныя маразы. Сучаснікі называлі тую зіму «зіма стагоддзя». Дзесяткі людзей загінулі з-за марозу ў сваіх машынах і проста на вуліцы. З-за абледзянення дротаў у шматлікіх гарадах адсутнічала электрычнасць. Снег засыпаў дарогі. Людзі сядзелі дома. Гарады здаваліся мёртвымі. Аднімі з галоўных ахвяраў жудаснага холаду сталі свінні, куры і каровы. Яны гінулі дзесяткамі тысяч. Натуральна, следствам катастрофы быў дэфіцыт мяса (рост коштаў на мясныя прадукты стаў фармальнай прычынай забастоўкі ў Гданьску ўвосень 1980-га), падзенне эканамічнага росту (першы раз у гісторыі Польскай Народнай Рэспублікі). Зіма 1978–1979 года спарадзіла яшчэ адзін цікавы рэвалюцыйны фактар. З-за жудаснага марозу і немагчымасці выйсці ў горад маладыя пары заняліся каханнем. Як вынік, у 1979 годзе ў краіне назіраўся сапраўдны бэбі-бум. Нарадзілася каля 35 тысяч дзяцей — на парадак больш, чым у мінулыя гады. Не цяжка ўявіць псіхалагічны стан маладых бацькоў у жніўні 1980-га, калі ў краіне пачаліся перабоі з прадуктамі. Леху Валенсе, на думку журналістаў, заставалася проста стрыгчы купоны і ў душы дзякаваць Дзеду Марозу.

### НІКАЛЯ САРКАЗІ



Прэзідэнт Францыі ўгорскага паходжання нечакана знайшоў тое, што можна імпартаваць са сваёй гістарычнай бацькаўшчыны. Мова пра сістэму прыватных ахоўных кантораў, якія вельмі папулярныя ў Венгрыі. Прыкладна адзін працэнт усяго працаздольнага насельніцтва гэтай краіны працуе ў паліцыі або прыватных ахоўных структурах. Сарказі лічыць, што Францыя павінна мець не горшы працэнт, і паставіў перад урадам задачу павысіць колькасць сяброў ахоўных фірм у гэтым годзе да 200000 чалавек (зараз іх 150 тысяч). Нашто Францыі столькі ахоўнікаў? На думку Сарказі, прыватны ахоўны сектар можа адыграць вырашальную ролю ў вайне з крыміналам. Будуецца гэта палітыка вайны з крыміналам на канцэпцыі «талерантнасць нуль», якая патрабуе самага жорсткага пакарання за любыя злачынствы. Такі курс, натуральна, патрабуе добрай сістэмы нагляду — функцыя, якую дзяржава з-за недахопу бюджэтных сродкаў проста не ў стане выканаць на сто працэнтаў. А вось калі кожная ўстанова акрамя прыбіральшчыцы абавязкова будзе мець у штаце ахоўніка, злачынствам у Францыі, на думку Сарказі, прыйдзе канец. Цікава, што другім саюзнікам у святым паходзе на бандытаў прэзідэнт назваў псіхіятраў, якія павінны даносіць на ўсіх, чые паводзіны і думкі можна трактаваць як антысацыяльныя. Перш за ўсё, мова пра падлеткаў. Псіхіятры ў адказ выдалі нешта кшталту маніфесту, у якім кажуць, што не будуць інструментамі ўраду. Самае цікавае, што рэалізацыя ідэі прэзідэнта можа мець самыя неверагодныя вынікі. Больш кантроль — значыць і большая колькасць вязняў. Між тым, у краіне катастрафічна не хапае месцаў у турмах. З 2002 года колькасць вязняў вырасла на 60 тысяч чалавек, а пабудаваць турмаў дзяржава паспела толькі на 50 тысяч.



НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# ФРАНАЧАК

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Як і ў выпадку з Паўлам Севярынцам, пачну фрашкай з асабістага жыцця. На маёй «плыні» ва універсітэце вучылася адна ўвішная дзеўчына. З першага курсу яна добраахвотна ўзваліла на сябе ўсе арганізацыйныя клопаты нашага навучання: прафсаюзныя зборы, прэзенты выкладчыкам, культпаходы — нічога не адбывалася без яе гіперактыўнага ўдзелу. Яна добра ведала, якому прафесару трэба самы прыгожы букет, якому — рарытэтную кнігу, а якому — гумарыстычную сцэнку і насценгазету напамяць. «Высунулі, а цяпер ніяк засунуць не можам», — часам кпілі мы з яе, згадваючы вядомага персанажа савецкай камедыі.**

На пятым курсе нашай «Шурачцы» прыйшлося сапраўды няпроста. Яна паралельна вучылася з намі, у Мінску, — і ў мытным каледжы ў сябе на радзіме, да таго ж у інтэрнаце выконвала адначасова функцыі правай і левай рук каменданта. Перад заканчэннем універсітэта арганізацыйных спраў значна паболела: «Шурачка» падбягала «збіраць па тысячы» ледзь не штодня. І вось аднойчы, у разгар дзяржаўных іспытаў, калі галава была затлумленая вучобай і дыпломам, я прысніла сон. Нібы на філфак прыйшоў генерал авіяцыі і абвясціў: «Мы выпраўляем у космас першых касманаўтаў эпохі незалежнай Беларусі. Абавязкова павінен паляцець адзін прадстаўнік вашага факультэту». Па актавай зале паляцеў гАлас неахвоты: сесія, а ім касманаўта падавай! І ўсе ўздыхнулі з палёгкай, бо наперад выйшла яна — «Шурачка». Ніхто нават не задумаўся, куды гэта ёй — з інтэрнатам і дзвюма ВНУ — яшчэ і ў космас. Заканчваўся сон пасяджэннем нашай групы ў факультэцкі буфет, побач з якім усталявалі касманаўцкі трэнажор, дзе «Шурачка» наразала колы пад столлю у перапынках паміж заняткамі.

Я думаю, калі б я прысніла гэты сон на некалькі год пазней, трэнажор стаяў бы ў памяшканні сядзібы БНФ, а пад столлю круціўся Франак Вячорка.

## Не такі, як усе

Адкуль увогуле гэтае панібрацкае «Франак» у загалоўках навінаў, рэпартажах, і нават у назве артыкула Вікіпедыі? Некаторыя мае калегі, у якіх працоўная мова — руская, нават не здагадваюцца, што Франак Вячорка — гэта тое самае, што Дзіма Паўлічэнка ці Саша Зімоўскі.

Франак рос у нас на вачах. Спачатку ён быў вядомы ў вузкіх колах грамадскіх актывістаў і аматараў беларушчыны як самы жвавы з трох дзяцей выбітнага апазіцыйнага палітыка Вінцука Вячоркі. Дзеці раслі, і неяк пакрысе стала відавочна, што Франак — нешта большае за нашчадка вядомай асобы. Яблык упаў ад яблыні. Увесь шум — ад таго, што цэлы кангрэс садоўнікаў ніяк не можа вырашыць, як далёка. «Ой Франачак, куды ты коцішся…» магло б стаць гімнам усіх нас, хто пільна сочыць за яго жыццём і барацьбой.

Тое, што цябе ўжо ў дарослым веку называюць дзіцячым іменем, і часта нават прозвішча тваё дадаваць няма патрэбы, — верны сімптом нават не народнай славы, а наўпрост выключнасці ды унікальнасці. Маці Тэрэза. Прынцэса Дыяна. Садам. Фідэль. Франак. У гэтым святле досыць забаўна, з'яўляючыся беларусам, глядзець разлічаны на замежнага гледача польскі дакументальны фільм 2006 года «Урок беларускай мовы». Франак, калі вы памятаеце, яго галоўны герой, які кажа пра сябе: «Я — звычайны беларускі маладзён». І пры гэтым відэашэраг дэманструе нам беларускага маладзёна вельмі нават незвычайнага. Звычайны беларускі маладзён не размаўляе свабодна па-польску (няхай і з моцным акцэнтам). Не раздае апазіцыйныя ўлёткі на вуліцах. Не мае пашпарту, заштампаванага памежнікамі ўздоўж і ўпоперак ад частых, але кароткіх паездак за мяжу з абавязковымі вяртаннямі на радзіму. І ўрэшце, не арганізоўвае з аднакласнікамі студыю гуказапісу, прадзюсіруючы дыскі песень пра родную школу (у яго выпадку — Нацыянальны ліцэй імя Якуба Коласа). І, падазраю, не марыць, каб Беларусь стала такой краінай, дзе ён зможа больш не раздаваць улётак, а спакойна заняцца якім-небудзь прыемным яму бізнесам. Прадаваць паштоўкі, калі я правільна згадваю. Наймацней з таго фільму мне ў памяць урэзаўся абавязковы прыём дакументалістыкі, калі яна хоча быць бліжэй да народу, — слайд-шоу здымкаў з сямейнага архіву. На адным з іх зусім маленькі, годзіка тры, Франачак сфатаграфаваны ў абавязковай для кожнага познесавецкага малога позе «ў садок прыйшоў фатограф». Нічога ніжэй за пояс не выдае ў нашым героі выключную дзетачку. Кароткія чорныя шорцікі і, па-мойму, чэшачкі — як ва ўсіх. Але вышэй пачынаецца сюр — на хлопчыку вышыванка, а ў ручцы надзейна сціснуты бел-чырвона-белы сцяжок. Мяне ў такім веку фатаграфавалі з цацачным тэлефонам. Праз год апраналі ў рускі народны какошнік, а яшчэ праз год — у касцюм мушкецёра.

Вельмі хацелася б напісаць нешта пра — як ён фігуруе ў знакамітай позве з ваенкамату — Францішка Вячорку, арыгінальна параўнаўшы яго з першадрукаром, у гонар якога, цалкам верагодна, хлопчык і быў названы ў не такім і далёкім ужо 1988 годзе. Але пішацца адно пра Франачка, бо ўвесь час увачу стаіць той дзіцячы здымак. З яго, я думаю, усё і пачалося.

## Такі, як не ўсе

Паменшыўшы-абласкаўшы яго імя, я не спынюся на дасягнутым. Мне здаецца, найлепей постаць Франачка раскрываецца праз паслядоўнае параўнанне з трыма яркімі жаночымі вобразамі савецкага, а пасля і расійскага экрану.

Першую асобу я ўжо згадвала. Актывістка Шурачка са «Службовага раману». З папраўкай на сферу дзеяння, актыўнасць нашага героя здаецца гэткай жа хаатычнай. Ён паўсюль, але ў той жа час не вельмі зразумела, чым ён, уласна, займаецца. Культарг партыі БНФ і журналіст з няскончанай адукацыяй — вось дзве яго іпастасі, якія я з пэўнасцю магу вылучыць. Далей можна пералічваць хіба дзеянні. Кіраваў дубляжом папулярных фільмаў на беларускую мову і прадаваў іх. Арганізоўваў смс-цкаванне журналіста БТ Дзяніса Бальшакова. Абараняў сядзібу ў Лошыцы ад бязглуздай рэканструкцыі. Вешаў на плошчы Якуба Коласа «Гісторыю Беларусі». Пратэставаў супраць выключэння сябе з універсітэту. Дасылаў міністру інфармацыі галаву свінні. Здымаўся ў кіно. Раздаваў улёткі. Пералік далёка няпоўны. Спіс заслугаў 21-гадовага Франака перад грамадствам здольны выклікаць бязмежную павагу, але ж камбінацыя гэтых заслугаў — іранічную ўсмешку.

Другая асоба, да якой фатальна падобны Франачак, — непараўнальная Леначка з «Карнавальнай ночы». Грацыёзная дзяўчына, харызматычная лідэрка, якая крэатыўна змагаецца супраць недалёкага дырэктара-дыктатара Агурцова і перамагае яго, залучыўшыся падтрымкай калектыву. Да таго ж, Леначка — не проста актывістка. Яна актывістка з муфтачкай. Гэтак жа і Франак — палітык у ружовым гальштуку. «Гламурны змагар», як кпліва любяць называць яго ў беларускім «доме культуры».

Магчыма, у гэтым і палягае галоўны недахоп шоубізнага прадукту, які паўстае пад лейблам «Франак». Чамусьці адчуваецца: усё, што намагаецца рабіць Франак у культуры і грамадскай сферы, ён робіць не з любові да культуры і грамадства, а каб давесці нешта выключна важнае свайму Агурцову. Калі «Палп фікшн» Квенціна Таранціна дублюецца беларускай мовай, каб пераканаць кагосьці, што вось, і Траволта можа сакатаць па-наску, — гэта ўжо не «Палп фікшн». А магчыма, усё дакладна наадварот: Франак раздае ўлёткі, бо яны аддалена нагадваюць яму паштоўкі.

## Такі, як усе

Калі ў СМІ прайшла навіна, што Франака «выцягнулі ў ваенкамат з ложка дзяўчыны», загаварылі — хто задаволена, а хто раздражнёна — пра тое, што нарэшце на экраны выйшла чарговая серыя любімага серыялу. Шмат хто знаходзіць непрымальным тое, што асабістае жыццё пэўнай асобы ўвесь час навідавоку. Жыццё Франака і сапраўды структурна нагадвае серыял — звычайныя здарэнні (выключэнне з ВНУ, позва ў ваенкамат), якія могуць адбыцца з кожным, прымаюць незвычайны ракурс (у нашым выпадку герой не здаецца, прынамсі — не здаецца так проста). У гэтым месцы мы ўсё-ткі дамо веры Франку з польскага фільму, які кажа пра сябе, што ён — «звычайны беларускі маладзён». Франак — такі, як усе, і свой у дошку, менавіта таму ўсё, што з ім адбываецца, не пакідае гледачоў яго жыцця абыякавымі. Уласна, тут можна знайсці адказ на самае вострае на дадзены момант пытанне беларускай інтэрнэт-супольнасці: ці піярыцца Франак?

Мне здаецца, не піярыцца. Прынамсі, не піярыцца адмыслова. Талент ператвараць уласнае жыццё ў бясконцае шоу — унікальны, але роднасны дару цара Мідаса рабіць золатам усё, да чаго б ты ні дакрануўся. І ў гэтым я знаходжу пэўнае падабенства майго героя з трэцяй знакамітай рускай паненкай — Ксюшай. Каторая Сабчак. Дзеці палітыкаў, якія яшчэ не вызначыліся, кім быць і хто яны па жыцці, але ўжо трапілі ў поле зроку СМІ розных адценняў жоўтага. Чые рашучыя жыццёвыя ўчынкі непазбежна стаюцца вядомымі шырокай аўдыторыі, што міма іх волі разбівае гэтую самую аўдыторыю на лагеры апантаных прыхільнікаў і зацятых ненавіднікаў. Безумоўна, яркія асобы.

А яшчэ я з упэўненасцю магу сказаць, да якой дзяўчыны Франак не падобны. Франак — не Паліна. Хаця б таму — і прадзюсерам спявачкі даўно час пачаць непакоіцца на гэты конт — што ніхто не называе Паліну Смолаву Поляй.

«На жаль, сённа беларуская эстрада — гэта каманда-аўтсайдэр Другой лігі. Яна ніколі не згуляе на роўных з еўрапейскімі зоркамі», — Франак ведае, пра што піша. Няхай б вар'яцкія скандалы не выдумвалі іх піяршчыкі, у зорак беларускай эстрады няма шанцаў на VIP-месцы ў свецкай хроніцы, бо ўсе яны надзейна занятыя беларускімі палітыкамі. Згодная, гэта не вельмі здарова — як для эстрады, так і для палітыкі. Але зірнем на пазіцыю Франака іначай. У грамадстве, дзе правячая эліта надзейна хавае ад грамадскасці асабістае жыццё, гатоўнасць прадстаўніка апазіцыі быць публічнай асобай выглядае як мужны ўчынак чалавека, які разумее, на што падпісваецца.

Фактычна немагчыма (зноў згадаем Паліну) стварыць сабе імідж ахвяры папарацы штучна. Папарацы не пачынаюць клацаць затворамі фотакамер перад тым, хто для іх не харызма. А для іх харызма той, хто харызма для масаў — такі ўжо закон. У гэтай сувязі — яшчэ адно мае асабістае перажыванне. Толькі аднойчы я бачыла «сіндром папарацы» ўжывую, а не ў кіно ці тэленавінах. Гэта здарылася ў жніўні 2008 года, калі менчукі ладзілі шэраг акцый па згаданай ужо абароне Лошыцкага парку і сядзібы. «Нешта зрабіць» аднachасова сабраліся «Моладзь БНФ», лідэрам якой з'яўляецца Франак, і «мірныя людзі», натхнёныя мастачкай Нікай Сандрас. Апошняя надзвычай абурылася тым, што ў грамадскую ініцыятыву мяшаецца апазіцыя: ёй здавалася, гэта сапсуе справу.

Скандал пагражаў паставіць крыж на добрых намерах усіх удзельнікаў, але бакам удалося дамовіцца. Мы стаялі перад ганкам Лошыцкай сядзібы пад густым даждом і падпісвалі звароты ў Мінгарвыканкам — як раптам пачаўся сапраўдны шквал фотаўспышак, нават светла зрабілася. На ганак, дзе ўжо стаяла Ніка, выйшаў Франак, каб дапоўніць яе прамову нейкімі словамі. Журналістам і блогерам закарцела захаваць у сваіх архівах сцэну прымірэння непрыяцеляў. Як выглядае, Ніка і Франак і сапраўды тады пасябравалі. Магчыма, кожнаму з нас варта пазнаёміцца з Франакам асабіста.

## Такі, не як усе

«Не б, як усе — пайшоў і адслужыў!» — рашуча абураецца правае паўшар'е грамадскай думкі. «Хлопец робіць правільна: нельга патураць злачыннай сістэме», — не менш рашуча пярэчыць левае паўшар'е, пакуль беларускія вайскоўцы і медыкі вырашаюць лёс прызыўніка Францішка Вячоркі. Здаецца, я цалкам падзяляю адно з гэтых меркаванняў. Але не скажу, якое. А лепш наастачу параўнаю свайго героя з яшчэ адной савецкай знакамітасцю (дарэчы, беларускай па паходжанні) — Валяй Цярашковай. Не ведаю, як патлумачыць гэта рацыянальна, але адчуваю: у прамым ці пераносным сэнсе — аднойчы той хлопчык у чэшачках і вышыванцы ўсё-ткі паляціць у космас.

***P. S. Аляксея Караля:** Абавязкова паляціць. У космас палітыкі, журналістыкі, кіно?.. Абярэ сам. Бо ёсць талент і моцны характар. Характар жа вызначаецца здольнасцю на ўчынак.*

*З той самай, уласцівай яму натуральнай лёгкасцю, пра якую піша Марыя Мартысевіч, юнак Франак Вячорка па заканчэнні ліцэя свядома адмовіўся ад магчымасці вучыцца ў любым прэстыжным замежным ВНУ. А потым яшчэ раз — пасля адлічэння з БДУ, нягледзячы на рэпрэсіі, што абрынуліся на яго. Ён выбраў Беларусь. Лёгка і натуральна. Як дыханне.*

*Трымаць гламурны флёр пад далёка не гламурным рэпрэсіўным ціскам — гэта таксама мужнасць. Вышэйшай пробы.*

ЗАБЫТЫЯ ІМЁНЫ

# АНТОН ВАЛЫНЧЫК ЖЫЎ ПЕСНЯЙ

Сяргей ЧЫГРЫН

**Хачу расказаць чытачам «НЧ» пра Антона Валынчыка — нашага таленавітага земляка, харавога дырыжора, кампазітара, педагога, заслужанага работніка культуры Беларусі. Таленавітага, але забытага.**

## За польскім часам

Нарадзіўся Антон Міхайлавіч Валынчык 23 ліпеня 1896 года ў вёсцы Мяльканавічы на Слонімшчыне ў сям'і царкоўнага рэгента. Пасля заканчэння Жыровіцкай духоўнай семінарыі быў прызваны ў войска, дзе 19-гадовым юнаком кіраваў салдацкім хорам. Пасля войска вярнуўся на радзіму і стаў працаваць выкладчыкам музыкі і спеваў у рэальным вучылішчы ў Лунінцы, пасля ў Клецкай беларускай гімназіі, потым у Навагрудскай беларускай гімназіі, а таксама ў беларускай настаўніцкай семінарыі ў Слоніме (1939–1947).

Вось што пра гэты час пісаў беларускі эміграцыйны часопіс «Віці» ў лютым 1957 года: «У 1927 годзе дырэкцыі Клецкай гімназіі ўдалося перацягнуць на працу як выкладчыка музыкі і спеваў вядомага кампазітара і слаўнага дырыжора Антона Валынчыка. Кампазітар Валынчык першым чынам узяўся за арганізацыю гімназічнага хору, у якім бралі ўдзел каля 60 вучняў. За тры месяцы працы Антону Валынчыку ўдалося наладзіць першае выступленне хору. Дасканала выкананыя беларускія песні, пераважна кампазіцыі самога дырыжора, мелі надзвычайны поспех. З гэтага часу пры дапамозе хору гімназія праводзіла шырокую нацыянальна-культурную працу ў самім Клецку ды ў навакольных вёсках, даючы частыя канцэрты. У наступным 1928 годзе кампазітар Валынчык арганізаваў струнны аркестр, які налічваў 50 асобаў. Наладжаныя канцэрты ды драматычныя паказы, маючы добры поспех, папаўнялі пустую касу гімназіі... У 1930 годзе кампазітар Валынчык перабраўся ў Наваградак і там працаваў у Навагрудскай беларускай гімназіі».

Пра музычную дзейнасць нашага земляка ў Навагрудку яшчэ пры жыцці падзяліўся са мной успамінамі актывіст беларускага руху ў Вільні Аляксей Анішчык: «Антон Валынчык, які працаваў у Навагрудскай гімназіі, арганізаваў выдатны хор і аркестр, бадай, найлепшыя ў Заходняй Беларусі».

Пра канцэрт у беларускай гімназіі пісала тады музыказнаўца Ірына Здановіч у ваяводскай газеце «Жыце Новогрудзке»: «Праграма была вельмі разнастайная. Разнароднасць песень, перапляценая з канцэртамі на мандалінах і танцамі, пакінула незнішчальнае ўражанне. Цудоўнай была кампазіцыя Антона Валынчыка «Вечарам». На гэтую мелодыю я звярнула ўвагу яшчэ намнога раней. Часта, ідучы вечарам дахаты, я з-за муроў беларускай школы слухала выплываючую адтуль сумную, журботную песню глухога вечара, якая раптам ператваралася ў сімфонію птушынага шчэбету, пошуму лісцяў. Спынілася я тады і доўга ўслухоўвалася ў гэтую дзіўную, нязнаную мелодыю. Публікі было вельмі многа, і яна з энтузіязмам і сімпатыяй вітала кожнаразовае выступленне хору... Навагрудак, 1930 год».

Не толькі спадарыня Здановіч высока ацэньвала талент Антона Валынчыка. Напрыклад, выкладчык музыкі і спеваў тагачаснай Навагрудскай дзяржаўнай польскай гімназіі прафесар Лазінскі не раз прыводзіў свае класы ў гімназію, каб паслухаць рэпетыцыі Антона Валынчыка. Прафесар глыбока шанаваў Валынчыка і адкрыта пакланяўся яго самабытнаму таленту. «Кожнаму, хто сустракаўся з Антонам Міхайлавічам Валынчыкам, назаўсёды запомніліся высокая культура і шчырая спагада гэтага чалавека. Яго сонечны характар нагадваюць мне мастакоў Язэпа Драздовіча і Пётру Сергіевіча. Відаць, гэта адметная рыса вялікіх мастацкіх талентаў», — пісаў у адным з лістоў з Вільні аўтару гэтых радкоў Аляксей Анішчык.



Антон Валынчык дырыжыруе хорам, 1970-я гады



Дачка Антона Валынчыка Дзіна, 1947 год



Антон Валынчык са слонімцамі ў родным горадзе. Слонім, 1 мая 1943 года

У кнізе «Памяць. Клецкі раён» надрукаваныя ўспаміны Антона Валынчыка пра той час, калі ён працаваў у Клецкай беларускай гімназіі. Вось невялікі ўрывачак з тых успамінаў: «Я памятаю ўсё. У мяне назаўжды ў памяці Клецкая гімназія. Там неяк усё было па-асабліваму, там выкладчыкі і навучэнцы жылі адной сям'ёй — душа ў душу. Але ў гімназію пастаянна прысылалі паганых інспектараў. Мэтай было закрыццё гімназіі. Памятаю, у 1929 годзе прыслалі з Віленскага куратарыума інспектара Мяноўскага — вельмі надобрага чалавека. Хадзіў на ўрокі, прыдзіраўся да дробязей, даводзіў выкладчыкаў да непрытомнасці. А я даведаўся, што ён украінец... І вечарам мы як далі яму канцэрт на паўгадзіны! Праспявалі і знакамітую «Кобзу» Давыдоўскага, і «Відзьма». Ну, і беларускія таксама: «Ліпы старыя», «Касцы» (гэта мае былі), народных вельмі многа. Ведаеце, «Ліпы старыя» я пісаў у 1927 годзе, калі быў страшна хворы, з высокай тэмпературай, у стане трызнення. Лепшая мая прамова. Мабыць, здолелі мы яго прыняць да душы. Ён нават расчуліўся і доўга дзякаваў. І галоўнае — ніякіх дрэнных наступстваў візіту!»

У 1937 годзе Антон Валынчык завочна скончыў Вышэйшыя музычныя курсы Варшаўскай кансерваторыі пры Крамянецкім музычным ліцэі. У гады вайны жыў у Слоніме, дзе кіраваў рознымі хорамі.

## За савецкім часам

Пасля вайны быў мастацкім кіраўніком Беларускага міжабласнога ансамбля песні і танца ў Ашмянах. Але потым над ім навіслі «чорныя хмары», і цудам ён выратаваўся ад рэпрэсій. Праўда, даволі працяглы час наш зямляк не меў дзяржаўнай службы, быў незапатрабаваны як спецыяліст. Каб выжыць, ён пачаў супрацоўнічаць з хорамі ў праваслаўных храмах. Кіраваў царкоўнымі хорамі ў Клецку, Навагрудку, Слоніме, Жыровічах, Мінску.

У 1956 годзе наш зямляк паехаў у Магілёўскую вобласць, дзе ўладкаваўся кіраўніком хору Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. Праз год вярнуўся ў Маладзечна, дзе яму прапанавалі быць кіраўніком міжабласнога Маладзечанскага ансамбля песні і танца. У свой калектыў Антон Валынчык сам шукаў людзей. Ён ездзіў па беларускіх гарадах і вёсках і ўсіх, хто любіў музыку і песні, збіраў у ансамбль.

Аднойчы быў такі выпадак. Крочыў Антон Міхайлавіч па адной з вуліц Пінска. Раптам чуе: аднекуль даносіцца песня. Цудоўны дзявочы галасок спявае: «Ой, рэчанька, рэчанька...» Уважліва прыслухаўся і накіраваўся туды, адкуль лілася песня. Увайшоў у маленькае кафэ і спыніўся ля ўваходу. Там нікога не было, акрамя маладзенькай дзяўчынкі. Яна прыбірала са сталоў і спявала. Убачыўшы Валынчыка, дзяўчынка збянтэжылася і спыніла песню. «Спявай, спявай. Гэта вельмі прыгожа», — сказаў ёй Антон Міхайлавіч. І калі яна закончыла спяваць, ён дадаў: «А можа ў наш ансамбль пайшла б?» Яна дала згоду...

Так папаўняўся яго калектыў у Маладзечне. Хутка ў ім было сорак юнакоў і дзяўчат, якія прыйшлі сюды, як кажуць, з гушчы народнай. Побач з імі працягваў крочыць па жыцці з песняй гэты ўлюбёны ў сваю справу чалавек. Ён валодаў амаль усімі музычнымі інструментамі. Але найбольш паважаў скрыпку і віяланчэль. Вучыўся Валынчык у кампазітара Туранкова, а таксама ў вядомага харавога дырыжора Ягорава.

Чатыры гады ўзначальваў Антон Валынчык Маладзечанскі ансамбль песні і танца. А ў 1961 годзе ён пераехаў у Гродна, дзе пачаў стала жыць. Там ён узначальваў кафедру музыкі і спеваў Гродзенскага педінстытута, адначасова працаваў хормайстрам Гродзенскага народнага ансамбля песні і танца «Нёман», мастацкім кіраўніком Гродзенскай народнай харавой капэлы настаўнікаў. Шмат кансультаваў як хормайстар многія харавыя капэлы Гродзеншчыны. Увасабляў у канцэртных праграмах творы І. Баха, Л. Бетховена, П. Чайкоўскага, Ф. Шуберта, С. Манюшкі, К. Вебера. Апрацоўваў беларускія народныя песні. Пісаў і рыхтаваў для выканання свае песні і хоры на словы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Адама Русака, Петруся Броўкі і іншых беларускіх паэтаў. Практыкаваў у хорах выкананне ў стылі «а капэла».

Шукаючы звесткі пра Антона Валынчыка, яшчэ ў 1990-х гадах спытаўся неяк пра яго ў заслужанага настаўніка Беларусі Апанаса Цыхуна. Апанас Пятровіч тады мне расказаў: «З Антонам Міхайлавічам Валынчыкам я часта сустракаўся, калі ён ішоў са спінінгам, вудамі і іншымі рыбацкімі прыладамі на Нёман. Апошні раз быў на Каляды ў ягонай кватэры разам з самадзейным кампазітарам Яўгенам Петрашэвічам. Валынчык тады ўжо цяжка хварэў, перанёс інсульт. Яго жонка Вольга Данілаўна выканала нам песню, якую даўней спявалі гімназісты Клецкай гімназіі кожны дзень перад пачаткам заняткаў і пасля іх — «Вучыся, нябожа, вучэнне паможа», здаецца, на словы Янкі Купалы. Хаця наш выдатны дырыжор і кампазітар стараўся прынесці як мага больш карысці роднай Бацькаўшчыне, але наменклатуршчыкі не любілі Антона Міхайлавіча. Так, ён без усялякай прычыны быў адхілены ад кіраўніцтва ансамблем песні і танца «Нёман», які меў ганаровае званне народнага. «Прышывалі» яму ярлыкі «неблаганадзёжный», «націоналист». Ён памёр 13 лістапада 1985 года. Пахаваны на гарадскіх могілках Гродна. На яго магіле няма помніка, пастаўлены просты жалезны крыж».

Шукаючы звесткі пра Антона Валынчыка, звярнуўся на днях да прафесара Гродзенскага універсітэта Аляксея Пяткевіча, які калісьці таксама добра ведаў кампазітара. Аляксей Міхайлавіч даслаў фотаздымак дачкі Антона Валынчыка Дзіны, а таксама трохі згадаў пра яго: «Вядома ж, я яго няблага ведаў, бо працаваў побач шмат гадоў ва універсітэце. Быў ён, несумненна, беларускім патрыётам, але за гэта шмат пацярпеў. І ўжо калі працаваў у педінстытуце, стаў закрытым у кантактах. І не толькі са мною. Баяўся. Але трымаўся паслядоўна свайго нацыянальнага рэпертуару ў калектывах, якімі кіраваў. Свае песні ствараў толькі, здаецца, па творах беларускіх паэтаў. У складзе гэтай кагорты — ён, Шырма, Цітовіч, Роўда, Шыдлоўскі... На яго 60-годдзі гаварыў пра яго слова на даволі сціплай урачыстасці ва універсітэце. Перад гэтым распытваў яго, цікавіўся лёсам і пазней. Ды ён не хацеў пра сябе казаць, усё адкрываць... З прыходам саветаў у 1939 годзе Антон Валынчык пераехаў з сям'ёй у Слонім у свой дом, які ён пабудаваў яшчэ пры паляках. Праўда, увесь дом Валынчыкі не займалі (ён, жонка Вольга Васільеўна і дачка Дзіна), а частку. Гэты дом знаходзіўся на Альбярцінскай вуліцы, 6. Тут наведвала мая жонка Дзіну, з якою сябравала, недзе ў сярэдзіне ці ў пачатку 1960-х гадоў. А затым Дзіна выйшла замуж і з'ехала ў Вільню...»

Вось такі мой невялікі аповед пра нашага земляка, кампазітара і дырыжора Антона Валынчыка. Пошукі звестак пра яго працягваюцца. І калі пасля гэтай публікацыі нехта адгукнецца і распавядае яшчэ што-небудзь пра гэтага чалавека, буду вельмі ўдзячны.

ЮБІЛЕЙ

# ГЕНЫ ЖЫЦЦЯ

Аляксей ХАДЫКА

**Да свайго 70-годдзя, якое сябры і прыхільнікі таленту Васіля Пятровіча Шаранговіча, мастака і дырэктара Музея сучаснага мастацтва, адзначылі 14 студзеня, Маэстра падрыхтаваў не толькі вялікую персанальную выставу. Літаральна «гарачымі», з друкарскага варштату ад выдавецтва «Кнігазбор» да юбілея Васіля Пятровіча прыйшлі першыя асобнікі аўтабіяграфічнай аповесці «Ген жыцця». Цэлыя 363 старонкі тэксту, які выкрывае яшчэ адзін талент юбіляра — літаратурны. Падзеі ў кнізе завяршаюцца 1995 годам — а гэта значыць, што майстар працягвае працаваць: чакайце другога тому. Кропка не пастаўлена.**





Маці. В. П. Шаранговіч. 1984

З Васілём Пятровічам Шаранговічам я перасёкся, калі пачаў чытаць лекцыі па гісторыі мастацтваў у тагачасным Тэатральна-мастацкім інстытуце (зараз — Акадэмія мастацтваў) у 1990 годзе. З 1989 па 1997 год Шаранговіч быў рэктарам установы, якую сам скончыў у 1966-м. Час гістарычных перамен, аднаўлення старадаўняй дзяржаўнасці нашай краіны, якая вырывалася з імперскіх абдымкаў СССР, ствараў непаўторную атмасферу ў сценах творчай вучэльні. Найперш атмасферу свабоды. Часам амаль неверагоднай.

Як прыгадвае крытык Пётра Васілеўскі, у першы год рэктарства Шаранговіча, у 1989 годзе, пяцікурснік Алесь Пушкін спрабаваў наладзіць у Інстытуце выставу сваіх творчых работ — плакатаў, прысвечаных гісторыі Беларусі апошніх сямідзесяці гадоў: Курапаты, Чарнобыль, лінгвацыд. Калі Шаранговіч пачуў пра тэматыку выставы, дык не дазволіў яе. У прыватнасці, рэктара спыніў плакат, які потым фігураваў ва ўсіх дзяржаўных газетах як сведчанне «злых намераў» Пушкіна. Выявы двух сцягоў — бел-чырвона-белага і БССРаўскага. БССРаўскі перакрэслены чорнымі лініямі. Надпіс: «Хопіць «сацыялістычнай», адродзім народную Беларусь!» Затое калі Пушкін зрабіў са сваімі плакатамі перформанс, выйшаў на вуліцу і быў затрыманы, калі чынавенства патрабавала яго выгнання з інстытуту, Шаранговіч уратаваў маладога мастака. На рэктара ціснулі: «Выгони Пушкина из института!», а Васіль Пятровіч запытаўся: «За што? Ён выдатнік вучобы. Яшчэ пабачыце, які ён зробіць дыплом!» Гэта быў 1989 год. Уявіце сабе нагэтулькі ж мужны ўчынак рэктара ВНУ нават зараз, у 2009-м.

Тое ж датычылася і мовы ў інстытуце. Рашэннем Васіля Пятровіча для выкладчыкаў былі ўведзены курсы беларускай мовы, але яны не былі прымусовыя. «Калі па-беларуску загаворыць начальства, па-беларуску будуць размаўляць і падначаленыя», — рэзонна зазначыў Шаранговіч. Працэс натуральнай беларусізацыі вядучай мастацкай установы краіны ішоў свабодна і глыбока, з чалавечым разуменнем яе неабходнасці ўсімі ўдзельнікамі падзей.

Нарэшце, варта не забываць, што менавіта ў Тэатральна-мастацкім, першым з беларускіх ВНУ, пры Шаранговічы спынілі выкладанне навуковага камунізму і дзейнасць кафедры гісторыі КПСС. Сённяшнім студэнтам, нават пры наяўнасці курсаў «ідэалогіі», спадчыннікаў партыйных дысцыплін, цяжка ўявіць, якім пачварным інструментам атуплення і сервілізацыі моладзі былі выкладаныя кафедрамі гісторыі КПСС дысцыпліны.

Чытачам «НЧ» напэўна было б цікава даведацца, якім чынам пры антынацыянальнай палітыцы ў СССР 1960-х гадоў Васілю Пятровічу так лёгка і нязмушана ўдалося звярнуцца да спадчыны вялікіх пісьменнікаў і паэтаў Беларусі — Янкі Купалы, Кузьмы Чорнага, Максіма Багдановіча. Пра гэта і яшчэ шмат іншага распавёў сам Васіль Шаранговіч:

— Вельмі істотна за пражытыя гады было прайсці простай дарогай і не схібіць. Здаецца, мне гэта ўдалося. Магчыма — гэта ўдзячная моц каранёў. З Качаноў, вёскі ў 36 хатаў на Мядзельшчыне, паходзяць і цяпер дзейсныя Шаранговічы, і рэпрэсаваны ў 1930-я гады першы сакратар ЦК КПБ В. Ф. Шаранговіч. Вёска жыла небагата, уласнай працай, але пра сваіх бацькоў я маю сказаць як пра вельмі адукаваных людзей. Улічыце, што пад уладай ІІ Рэчы паспалітай Польскай адукацыя давалася толькі за грошы. Маці скончыла 6 класаў польскай школы, на сёмы не хапіла сродкаў, і добра ведала літаратуру, паэзію, музыку. Яна марыла зрабіцца мастачкай — два яе малюнкі каляровымі алоўкамі я захоўваю да сённяшняга дня. Менавіта яе парады былі маімі першымі ўрокамі малявання.

А кнігі, якія таксама здабываліся няпроста, увайшлі ў маю свядомасць падчас чытання ў хаце, калі маці працавала. Так было з «Новай зямлёй» Коласа, якую я яшчэ дзіцём вывучыў напамяць. Праілюстраваць гэты ўлюбёны твор — а частку з ілюстрацый вы можаце зараз бачыць на выставе — мне давялося значна пазней (серыя з 91 акварэлі 2002 г.). Ужо ў вучэльні, а пазней у інстытуце ў Мінску, дзе ў інтэрнацыянальным асяроддзі я быў ці не адзіным студэнтам з вёскі, за маю выключную памяць, дзякуючы якой я быў здольны гадзінамі дэкламаваць вершы, я атрымаў мянушку «прафесар», пазней — «хадзячага кампутара». Літаратурныя багацці, адкладзеныя з юнацтва ў маёй памяці — пераважна беларускія. Мая маці ставілася да паэзіі і прозы нашых суайчыннікаў часам са здаровай крытыкай. Зямляк Максім Танк, які нарадзіўся за 8 кіламетраў ад Качаноў, неаднойчы быў крытыкаваны ёю на фоне Купалы і Багдановіча, бо «паэзія мусіць быць узнёслай». Таму мой зварот да нацыянальнай тэматыкі ў складаныя 1960-я гады — цалкам натуральны.

Што ж датычыцца бацькі, сапраўднага волата-асілка з мужнымі рукамі, які мог працаваць і ў полі, і як кравец і шавец — толькі гузікаў не мог замацаваць, бо маленькая голка не трымалася ў яго пальцах, — то і ён здабыў добрую адукацыю. Пасля 4-гадовай ЦПШ ён скончыў польскую «школу ральнічу», атрымаўшы дыпломы каваля, сталяра і слесара. Так, сям'ю Шаранговічаў цалкам можна назваць інтэлігентнай. Бацькам хапала часу і на забавы з усімі 5 дзецьмі, якім, у адрозненне ад простых сялянскіх сем'яў, рабілі адмысловыя забавы, майстравалі лялькі, на Каляды ставілі ялінку. А пазней дбалі пра адукацыю: ужо ў 14 гадоў я выбраўся ў школу ў Мядзел. І хаця на шляху да мастацкай прафесіі давялося перажыць і халодныя, і галодныя гады, я не страціў галоўнага. Гэта — вернасць роднай зямлі і вера ў веды».

Сапраўды, зямля і народ Беларусі — у кожным творы Васіля Пятровіча. Невыпадкова ён кажа, што нават на сваёй дыпломнай працы ў мастацкай вучэльні — «Пасля сходу» — памятае кожнага чалавека. На акварэлях, алоўках, літаграфіях і лінарытах — краявіды, пагоркі, азёры і сосны роднага Нарачанскага краю. На слынных ілюстрацыях сярэдзіны 1980-х да «Пана Тадэвуша» — мужныя людзі старой Літвы. На ранніх гравюрах 1960-х — рамантыка маладосці, Мінск, першая даніна нацыянальнай літаратуры. Пяшчотны свет сям'і — на нязмушаных, лёгкіх партрэтах сваякоў і блізкіх. Юбілейныя выставы не заўсёды бываюць такімі свабоднымі і шчырымі. Наведайце Музей сучаснага мастацтва і не спазніцеся зрабіць гэта да 31 студзеня!

**ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**
З 22 студзеня пачаў працаваць сайт «Новага часу» у новай інтэрактыўнай версіі.

Новы дызайн.
Новыя матэрыялы.
Новая сувязь.

**www.novychas.org**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
**novychas.org;** novychas@gmail.com; chasnavinau@gmail.com;
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 23.01.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.